Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІПЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №135 (28499)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Хто перамог на «Славянскім базары»?

СТАР. 3

Баршчэўнік бывае розным...

СТАР. 7

Скарына як пераможца

СТАР. 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ЗАНЕЎСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:

«Прагназуецца, што больш нізкія адносна мінулага года тэмпературы паветра пры павышанай вільготнасці не павінны аказаць адмоўны ўплыў на асноўную масу збожжавых культур. Валавы збор ураджаю збожжавых і зернебабовых культур будзе не ніжэйшы, чым летась. Масавая ўборка, як мяркуецца, пачнецца на наступным тыдні, у Гомельскай вобласці гэта можа быць раней, у Віцебскай — пазней. У гэтым годзе мы пазней пасеялі культуры, адпаведна, пазней масава прыступім да ўборкі збожжавых».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.07.2017 г.

Долар ЗША	1,9513	▼
Еўра	2,2331	▼
Рас. руб.	0,0330	▲
Укр. грыўня	0,0751	▼

ISSN 1990 - 763X

ПРАКАВЕТНАЕ

ЗЁЛКАВЫ ФЭСТ НА ПЯТРОВІЦУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Траўніца з вёскі Кузьмічы Раіса ВАЛЬКОВА. Свае веды пра лекавыя травы жанчына атрымала ад маці і бабулі. У вольны ад работы час, а Раіса працуе мастацкім кіраўніком у вясковым Доме культуры, збірае зёлкі, сушыць, робіць зёлкавыя духмяныя калекцыі і настойкі. На фестывалі-кірмашы яна паказала свае зёлкавыя зборы і падзялілася ведамі з жыхарамі і гасцямі свята.

Пятрок, альбо Пятроў дзень, як вядома, прыпадае на самы разгар лета, на 12 ліпеня. Даўней на поўдні Міншчыны, у Любанскім раёне, у гэты час збіраліся шумныя і шматлюдныя кірмашы, ладзіліся фэсты. Не сцёртая з народнай памяці самабытная традыцыя святкавання дала падставу для адраджэння і працягу народнага свята. І таму спрадвечная і прыгожая мясцовая назва свята — Пятровіца — зноў загучала. У вёсцы Шыпілавічы, на радзіме вядомага беларускага этнографа, пісьменніка і публіцыста Паўла Шпілеўскага ў пятроўскія дні не першы год праводзяцца міжнародныя маладзёжныя летнікі па вывучэнні бытавых танцаў, этнаграфіі і фальклору. Гэтым разам у Шыпілавічы прыехалі некалькі збіральніц зёлак са свежымі букетамі кветак і калекцыямі сушаных траў. Таму фестываль неафіцыйна назвалі «зёлкавы кірмаш».

СТАР. 12

■ Рынак працы

Колькасць вакансій у сталіцы павялічылася

Мінску патрэбны медыкі і прадаўцы, а ў службе занятасці просяць вакансію вартаўніка

Час, калі проста наяўнасць дыплома давала гарантыю працаўладкавання, даўно мінуў. Цяпер работадаўцы глядзяць у першую чаргу на кваліфікацыю, працоўны вопыт і, хоць гэта і забаронена законам, на ўзрост саіскальніка. Уладкавацца на працу ў сталіцы традыцыйна лягчэй, чым у рэгіёнах, але ўсё ж і тут ёсць «хранічна беспрацоўныя». Ці можна намаляваць абагульнены партрэт такіх людзей, хто ў групе рызыкі, і наогул, на што сёння можа разлічваць мінчанін, які знаходзіцца ў пошуку працы? Аб сітуацыі на сталічным рынку працы і рабоце службаў занятасці мы распыталі старшыню камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанну РАМАНОВІЧ.

— Традыцыйнае першае пытанне: якая на сённяшні дзень сітуацыя з занятасцю ў сталіцы?

— У студзені 2017 года ў эканоміцы горада было занята 1 061 500 чалавек — гэта амаль 76% працоўных рэсурсаў. Тут жа, напэўна, узнікае пытанне: а дзе ж астатнія 24%? Не варта палохацца. Па даных за 2016 год, усяго ў сталіцы працоўныя рэсурсы складаюць 1 405 300 чалавек. У гэтую лічбу ўваходзяць як занятыя ў эканоміцы, так і іншыя мінчане ў працаздольным узросце, у тым ліку гэта асобы, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных, студэнты дзённых аддзяленняў ВНУ і ССНУ — іх у Мінску налічваецца больш за 153 тысячы чалавек. Сюды можна дадаць і мам, што знаходзяцца ў водпуску па цяжарнасці і родах і па доглядзе дзяцей да 3 гадоў — іх у нас 95 600 чалавек.

СТАР. 4

■ Спецыяльны рэпартаж

АБІТУРЫЕНЦКІ «ДЭДЛАЙН»,

або Ускочыць у апошні вагон

Фота Надзеі БУЖАН.

Учора ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі краіны скончыўся прыём дакументаў на бюджэтную форму навучання. Для многіх абітурыентаў гэта азначала фінальную магчымасць сёлета падаць паперы на атрыманне бясплатнай адукацыі або проста змяніць рашэнне аб будучай спецыяльнасці. Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся да галоўнага корпуса Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, каб пазнаёміцца з тымі, хто адклаў вырашэнне свайго лёсу на самы позні час.

СТАР. 3

ЯК СПРАВЫ Ў СУДАХ?

Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Вярхоўнага суда

Эфектыўнасць работы пасля аб'яднання агульных і эканамічных судоў стала адной з тэм размовы. Да таго ж кіраўнік дзяржавы і Валянцін Сукала, старшыня Вярхоўнага суда, абмеркавалі пытанні аптымізацыі і ўдасканалення правапрымяняльнай практыкі ў некаторых сферах.

Прэзідэнт папрасіў Валянціна Сукалу падзяліцца сваім меркаваннем наконт сучасных тэндэнцый у эканоміцы, зыходзячы з аналізу судовых спраў: «Ваш пункт гледжання і вашы ацэнкі па дзейнасці вашых калег — тых, хто прыносіць у суды справы, асабліва крымінальныя. Мабыць, у эканоміцы нейкія (у вас гэта відаць, як у люстэрку, па гаспадарчай частцы) небяспечныя тэндэнцыі вызначаюцца або адбываюцца, зыходзячы з спраў, якія паступаюць».

Аб'яднаная судовая сістэма агульных і эканамічных судоў працуе ў Беларусі на працягу трох гадоў. За гэты час былі вырашаны ўсе асноўныя пытанні: прайшла адаптацыя судаводства да новых умоў. Па словах Валянціна Сукалы, зараз судовая сістэма ўстойлівая і рацыянальная. Правасуддзе стала аператыўней рэагаваць па справах як у эканамічных, так і ў агульных судах. Плануецца скараціць колькасць адкладання, прыпынення і перапынкаў у працэсе разгляду судовых спрэчак. За кошт гэтага і комплексу іншых мер правасуддзе будзе больш аператыўна аднаўляць парушаныя правы грамадзян.

Падчас размовы таксама абмеркавалі змены ў Вярхоўным і абласных судах. Аптымізацыя закране толькі апараты вышэйстаячых судоў, пры гэтым будзе захаваны судовы корпус і якасць правасуддзя. Калі нарматыўная база для правядзення аптымізацыі будзе зацверджана ў найбліжэйшы час, то працаваць у новых умовах суды пачнуць з 1 жніўня.

Таксама на сустрэчы паднялі пытанні павышэння эфектыўнасці інстытута банкруцтва. Акрамя таго, Прэзідэнту далажылі, што новы будынак Вярхоўнага суда плануюць завяршыць ў лістападзе 2018 года.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

РОЛЯ ДЫПЛАМАТЫІ РАСЦЕ

Учора ў Мінску прайшло пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў АДКБ. Перад ім Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў дзяржаў — удзельніц Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы. Нагадаем, што наша краіна цяпер старшынствуе ў ДКБ. Беларусь вызначыла прыярытэтам якаснае ўмацаванне ўплыву Арганізацыі на міжнароднай арэне, што стала адной з тэм сустрэчы.

— У сучасных умовах крызісу міжнародных адносін шматразова павышаецца роля дыпламатыі. Менавіта дыпламаты павінны прадэманстраваць свае ўменні, каб, вобразна кажучы, не даць ні найменшай магчымасці звярнуцца да сілавога вырашэння спрэчных пытанняў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што «сітуацыя ў свеце трывожная, таму неабходна ўдзяляць самую пільную ўвагу пытанням бяспекі нашых дзяржаў. Пры гэтым не толькі з ваеннага пункту гледжання, але і з палітычнага».

Не так даўно Прэзідэнт сустракаўся з міністрамі абароны і сакратарамі саветаў бяспекі дзяржаў — удзельніц АДКБ. Беларускі лідар расказаў, што падчас дыялогу абмяркоўваліся напрамкі, на якіх важна акцэнтаваць увагу. Да такіх сфер адносяцца, напрыклад, тэрарызм, наркатрафік, нелегальная міграцыя і кіберзлачыннасць.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

У тэму

Генеральны сакратар Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы Юрый ХАЧАТУРАЎ выказаў занепакоенасць маніпуляцыямі вакол рэгіянальных канфліктаў і нарошчваннем ваеннай актыўнасці ў Еўропе, бо гэта можа прывесці да парушэння стратэгічнага балансу. У сучасным кантэксце вялікая роля належыць удасканальванню механізма знешнепалітычнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц АДКБ.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ паведаміў, што на пасяджэнні Савета Міністраў замежных спраў АДКБ абмеркавалі пытанні, якія вынесуць на разгляд чарговай сесіі Савета калектыўнай бяспекі на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. Напрыклад, будзе падрыхтавана Дэкларацыя ў сувязі з 25-годдзем Дагавора аб калектыўнай бяспецы і 15-годдзем арганізацыі. Правесці чарговую сесію Савета калектыўнай бяспекі плануюць у Мінску бліжэй да канца года.

■ Будзьце пільныя!

КУДЫ ГЛЯДЗЕЛІ БАЦЬКІ?

Дзіцячая смяротнасць за апошнія пяць гадоў знізілася больш як у два разы. У 2011 годзе ў краіне загінулі 262 дзіцяці, летась — 154. Але гэта зусім не значыць, што бацькі могуць страціць пільнасць.

«Штогод 20—30 дзяцей гінуць ва ўзросце да года. Дзеці малодшага ўзросту гінуць з-за недагляду дарослых, па віне бацькоў, — адзначае **галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Валянціна ВАЎЧОК.** — Толькі за два тыдні ліпеня загінула ўжо восем дзяцей. Па меры таго як дзіця падрастае, на большую колькасць рэчаў трэба звяртаць увагу і яшчэ больш пільна сачыць за тым, што робіць у гэту хвіліну ваша дзіця».

Горача на вуліцы? Адчынілі фортку? Не выходзьце з пакоя, пакуль не зачыніце. Адсуньце ад акна мэблю і прыстасаванні, якія дапамогуць дзіцяці ўскараскацца на падаконнік. Пасля мінулагодніх выпадкаў падзення дзяцей з вокнаў Следчы камітэт, дарэчы, прапанаваў змяненні, паводле якіх цяпер у дзіцячых садках, школах, бальніцах, паліклініках і жылых будынках трэба прадугледжваць дзіцячыя замкі бяспекі на вокнах. Перавярнуўся батут (дзякуй богу, ніхто асабліва не пацярпеў) — распрацавалі з падачы таго ж камітэта і новы рэгламент выкарыстання гульнявога надзіманага абсталявання: як павінен быць замацаваны батут, колькі людзей на ім можа адначасова знаходзіцца і г. д. І зноў жа, дзеці — нашы, значыць, нам і прыглядацца трэба, як ды што там умацавана. А іначай... Вось у адзін толькі ліпеньскі дзень у Буда-Кашалёўскім раёне хлопчык спрабаваў забрацца на цагляны мур вышынёй 2,5 м, мур абваліўся, дзіця загінула. А ў Шклоўскім раёне хлопчык упаў з балкона другога паверха новабудоўлі, цяпер у рэанімацыі.

Лета хоць і халоднае, але шасцёра непаўналетніх ужо патанулі (усяго сёлета патанулі 11 дзяцей, у тым ліку ў Нясвіжы дома ў ванне затанула 6-месячнае дзіця). Адзін спрабаваў пераплыць вадаём, другі раскачваўся на дрэве ды сарваўся, трэці наглытаўся вады ў сажалцы, неабсталяванай для адпачынку... Трое дзяцей загінулі сёлета ў агні. Даступнымі для іх застаюцца запальніцы і запалкі. Дарослыя распальваюць печы і сыходзяць з дому, закрываючы малых адных...

«Мы плануем ахапіць прафілактычнай работай практычна ўсе сем'і, якія выхоўваюць дзяцей. Гэта не праверкі, а гутаркі інспектара з бацькамі, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Не так даўно выйшла сацыяльная рэклама «Ганарымся, што навучылі» з акцэнтам на тое, што бацькі павінны ганарыцца, што навучылі сваіх дзяцей бяспечным паводзінам. У Віцебску, Гомелі, Лідзе ды ў іншых абласцях будуць працаваць цэнтры бяспекі, дзе ў інтэрактыўнай форме дзецям дадуць веды па бяспечных паводзінах у самых розных сітуацыях».

Спецыялісты раяць дэталёва вывучыць навакольле сваіх кватэр і дамоў: што трапляе ў поле зроку вашага дзіцяці — што яно можа адчыніць, куды залезці, да чаго дацягнуцца... Ці ўмееце вы вазіць немаўля ў калясцы? Дзе вы захоўваеце лекі? А алкаголь? На шчасце, летась не зафіксавана ніводнага смяротнага атручэння алкаголем, але бывае ўсякае.

Дзесьці да 12—13 гадоў дзіця пастаянна трэба трымаць у полі зроку або браць з сабой. Яго нельга нідзе і ніколі пакідаць без нагляду. «Дзеці пастаянна пазнаюць свет, але што можа забяспечыць зніжэнне траўматызму? — разважае **галоўны дзіцячы артапед-траўматолаг Міністэрства аховы здароўя Дзмітрый ЦЕСАКОЎ.** — Неабходна развіваць самаканторль...»

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

■ Нашы людзі

У СТАЛІЦЫ ПРАЙШОЎ VII З'ЕЗД БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

У ім прынялі ўдзел больш за 300 дэлегатаў з больш чым 20 краін свету. У мерапрыемстве прыняў удзел міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ.

Сёння ў краінах свету, па розных звестках, пражывае ад 3 да 4 мільёнаў беларусаў. «Мы шчыра зацікаўленыя ў тым, каб паслядоўна нарошчваць удзел дыяспары ў сацыяльным, эканамічным, духоўным, культурным развіцці Беларусі, захаванні, прымнажэнні яе традыцый, — цытуе БЕЛТА Уладзіміра Макея. — У кожнага з нас свой погляд на жыццё, на развіццё краіны — гэта нармальна. Але кожны на сваім месцы можа многае зрабіць для дасягнення галоўнай мэты — не толькі захавання, але і ўмацавання незалежнасці беларускай дзяржавы».

Па словах міністра, Міністэрству замежных спраў і беларускай дыяспары неабходна вызначыць перспектыўныя сферы для супрацоўніцтва. Пачаткам можа стаць арганізацыя культурных іміджавых мерапрыемстваў, акрамя таго, найважнейшым напрамкам з'яўляецца вяртанне на беларускую зямлю культурных каштоўнасцяў.

Нагадаем, нядаўна Прэзідэнт на нарадзе па прыярытэтах знешняй палітыкі паставіў задачу больш актыўна развіваць узаемадзеянне з дыяспарай. «Мы зараз будзем вельмі шчыльна працаваць над гэтай праблематыкай. Ужо ёсць канкрэтныя прапановы. У найбліжэйшай будучыні гэта будзе мець аддачу», — дадаў Уладзімір Макей.

Таксама міністр замежных спраў закрануў аспект міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі ў рамках АБСЕ. На яго думку, наша краіна здольная стаць пляцоўкай для «Хельсінкі-2» — дыялогу для пераадолення існуючых супярэчнасцяў ва ўзаемаадносінах паміж краінамі Еўраатлантыкі і Еўразіі. «Мінск гатовы стаць пляцоўкай для такога дыялогу. Працэс урэгулявання ўкраінскага крызісу паказаў, што мы здольныя выконваць такія складаныя і адказныя задачы», — адзначыў міністр.

Уладзімір Макей пракаментаваў і адносіны з Еўрапейскім саюзам. Паводле яго слоў, у рабоце над двухбаковымі пагадненнямі аб рэадмісіі і аблягчэнні візавага рэжыму ёсць шэраг тэхнічных момантаў, якія патрабуюць дапрацоўкі. «На гэтым этапе нашы еўрапейскія партнёры, на жаль, прапаноўваюць занесці ў гэтыя пагадненні моманты, якія для нас непрымальныя і ў пэўнай меры палітызуюць іх», — дадаў ён. На думку міністра замежных спраў Беларусі, стандарты павінны быць адзіныя для ўсіх.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Кангрэс ЗША асцерагаецца росту дэфіцыту бюджэту

Дэфіцыт бюджэту ЗША праз дзесяць гадоў складзе 720 мільярдаў долараў замест ператварэння ў невялікі прафіцыт. У бюджэтным кіраванні Кангрэса адзначылі, што каманда прэзідэнта Дональда Трампа дарма разлічвае на паскарэнне тэмпаў эканамічнага росту на ўзроўні трох працэнтаў ВУП, перадае Associated Press.

У Кангрэсе лічаць, што рост магчымы толькі ў межах 1,9% ВУП гадавых. Па разліках спецыялістаў, у кожны асобна ўзяты год дэфіцыт будзе перавышаць 585 мільярдаў долараў. Такога значэння гэты паказчык дасягаў у 2016 годзе пры прэзідэнце Бараку Абаме. Адзначаецца, што адміністрацыі Трампа ўдасца скараціць выдаткі не на 5,6 трыльёна долараў, як было абяцана на наступнае дзесяцігоддзе, а толькі на 3,3 трыльёна.

У маі амерыканскі лідар падпісаў федэральны бюджэт да верасня 2017 года. Згодна з дакументам, на абаронныя выдаткі выдзелена амаль 600 мільярдаў долараў, з іх 15 мільярдаў — дадатковыя выдаткі на ўзмацненне барацьбы з тэрарызмам.

У Расіі абмяркоўваюць забарону продажу алкаголю на выхадных



У Міністэрстве аховы здароўя Расіі абмяркоўваецца пытанне аб уключэнні ў Стратэгію фарміравання здаровага ладу жыцця насельніцтва палажэння аб увядзенні забароны на продаж алкаголю ў выхадныя дні, пішуць «Вести».

З адпаведнай прапановай выступіў Дзяржаўны навукова-даследчы цэнтр прафілактычнай медыцыны пры міністэрстве. На думку навукоўцаў інстытута, крокаў па барацьбе са злоўжываннем алкаголем і прафілактыцы алкагалізму, якія прымаюцца цяпер, недастаткова. У мясцовых улад ёсць права абмяжоўваць месца і час продажу алкаголю, але па краіне, як правіла, не практыкуюць забарону, якая доўжыцца больш за адны суткі. «Адсутнічаюць абмежаванні на продаж алкаголю ў выхадныя дні», — пазначана ў праекце.

Як адзначаецца, пасля ўзгаднення дакумента на міжведамасным узроўні стане ясна, якім чынам прапанова аб забароне продажу спіртнога ў выхадныя можа быць рэалізавана на практыцы. У якасці прыкладу існуючых сур'ёзных абмежаванняў продажу алкаголю прыводзіцца Чукоцкая аўтаномная акруга. У некалькіх вёсках гэтага рэгіёна немагчыма купіць спіртное ад аднаго да шасці дзён на тыдзень. У сяле Краснене Чукоцкага муніцыпальнага раёна алкаголь наогул не прадаюць.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю ГРЭМЯНОК Святланы Аляксандраўны, былога работніка Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, і выказвае шчырае спачуванне яе родным і блізкім.

■ Блізкая ўлада

«У НАС СКАРДЗІЦЦА НЕ ПРЫВЫКЛІ»

За тры гадзіны суботняй прамой лініі тэлефон Хоцімскага райвыканкама, на якім дзяжурыў намеснік кіраўніка раённай улады Мікалай ХУЧАЎ, ні разу не званіў.

— Нічога ў гэтым незвычайнага няма, — усміхаецца Мікалай Адамавіч. — Мы працуем на апярэджанне. Таму сёння нават на абласную прамую лінію з нашага раёна не тэлефанавалі. Звычайна народ просіць то дарогу прагрэйдзіраваць, то колькасць рэйсаў на аўтобусных маршрутах павялічыць. Была справа, слуп аднаму перашкаджаў каля агароджы, другі прасіў дрэва спілаваць. Розныя бываюць жыццёвыя моманты. Мы выходзім з пазіцый, што чалавек заўсёды мае рацыю. Калі ён звяртаецца, значыць, трэба дапамагчы.

За паўгоддзе, на 1 ліпеня, у Хоцімскі райвыканкам паступіла 33 звароты — на адзін менеў, чым за аналагічны перыяд летась. Адзін прадпрымальнік звярнуўся, каб яму выдзелілі зямлю для вядзення фермерскай гаспадаркі. Было выбрана некалькі ўчасткаў, дзе трэба правесці ачыстку ад кустоўя, раскарчоўку старых дрэваў. Фермеру варыянты спадабаліся, і ён узяўся за добраўпарадкаванне. Быў зварот ад адной маладой жанчыны, у якой вельмі рэдкае захворванне і патрэбна дарагое лячэнне. Па выніках гэтага звароту быў адкрыты разліковы рахунак, грошы збіралі ўсім раёнам, дапамогу аказаў і Магілёўскі аблвыканкам. Але такія звароты — адзінкавыя, часцей за ўсё людзей хвалююць пытанні камунальнага паходжання або па садзейнічанні ў працаўладкаванні. «Былі выпадкі, калі спажыўцы камунальных паслуг сумняваліся ў правільнасці налічэння сумы за карыстанне. Лічбы перапраўвяралі, але ніякай памылкі не знаходзілі, — сведчыць **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Хоцімскага райвыканкама Наталля ХОЛАЛАВА.** — А тым, хто не можа знайсці работу, прапаноўваецца не менш за тры вакансіі. Нехта пагаджаецца, а нехта разлічвае на штосьці іншае і працягвае шукаць. Але зусім невырашальных пытанняў у раёне няма. Часцей за ўсё мы хутка знаходзім агульную мову з тымі, хто звярнуўся. А проста так нашы людзі не прывыклі скардзіцца».

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

АБІТУРЫЕНЦКІ «ДЭДЛАЙН»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Апоўдні каля будынка, у якім прымалі дакументы, вялікага ажыятажу не назіралася. Гэта пацвярджалі і студэнты, якія не першы год працуюць падчас прыёмнай камісіі кансультантамі. Паводле іх слоў, сёлета пераважная большасць абітурыентаў падавала дакументы загадзя. У апошні дзень сюды прыйшлі збольшага тыя, хто зусім не быў упэўнены ў сваіх сілах або сумняваўся ў патэнцыйнай прафесіі.

— Мы дапамагаем абітурыентам зрабіць канчатковы выбар спецыяльнасці, — расказаў **кансультант, студэнт машынабудаўнічага факультэта Аляксей ВІХОР.** — Падрабязна тлумачым, кім яны будуць пасля выпуску, якія асаблівасці навучання ў нашай ВНУ, умовы пражывання ў студэнцкім інтэрнаце і многае іншае. Саміх абітурыентаў у першую чаргу хвалююць непасрэдна прахадныя балы — гэта інфармацыя абнаўляецца кожную гадзіну: як у інтэрнэце, так і на папяровых бланках, што вывешваюць на стэндах у корпусе. Яшчэ пытаюцца, наколькі складана вучыцца, як размяркоўваюць выпускнікоў, а хлопцаў нярэдка цікавіць магчымасць трапіць на ваенную кафедру.

Большасць абітурыентаў была сканцэнтравана каля аўдыторый, у якіх праходзіла непасрэдна падача дакументаў. Нехта нервавaўся і ўважліва сачыў за лічбамі на стэндах, іншыя стаялі ў чарзе, каб трапіць у запаветны пакой з прыёмнай камісіяй. Многіх у адказны дзень суправаджалі блізкія, пераважна мамы.

— Мы доўга вызначаліся з выбарам, ды і дагэтуль вагаемся, — кажа **Аксана НЕСЦЕР,** якая прыйшла падаваць дакументы разам з сынам Юрыем. — Хацелася б трапіць на «бюджэт», таму будзем чакаць да апошняй хвіліны. ЦТ здалі сярэдне, таму і адкладалі рашэнне да апошняга дня. Ужо напісалі заяву на будаўнічы факультэт, пэўна, туды і будзем падавацца. Пакуль што па прахадным бале ўсё добра. Калі раптам не пройдзем, то паспрабуем трапіць на «платнае» на больш прэстыжны факультэт тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі: або на «эканоміку і кіраванне», або на «мытную справу». Абнаўляюць інфармацыю часта, таму ўсё адкрыта і зразумела.

Дзіяна ШКУЛЕПА стаіць у чарзе на падачу разам з мамай Таццянай. Дзяўчына ўжо падавала дакументы на будаўнічы факультэт, цяпер жа вырашылі «перакінуць» паперы на машынабудаўнічы. Для сям'і пытанне бюджэтнага навучання прынцыповае — калі з вышэйшай адукацыяй не складзецца, панясуць дакументы ў адзін з каледжаў. Пакуль што ўсё добра, Дзіяна мае запас па балах. Але мама і дачка нервуюцца — усё можа змяніцца нават у апошнюю хвіліну.

— Я чакаў апошняга дня, каб бачыць прыкладныя прахадныя балы і зрабіць узважанае і спакойнае рашэнне, — кажа **абітурыент Яраслаў ХІХЛУН.** — ЦТ здаў сярэдне, але прыкладна гэтага і чакаў. Здаваў матэматыку, рускую мову і фізіку, дадаткова англійскую мову. Сёння падаў дакументы на факультэт інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі, хачу працаваць у сферы ІТ. Сёлета прахадны бал значна вырас — балаў на 20 у параўнанні з мінулым годам. На «бюджэт» — 325, таму пайду на платнае, мае бацькі не супраць. Летась туды збіралі з сумай сертыфікатаў у 210 балаў. Калі і на платнае не атрымаецца, пазначыў у заяве іншыя ІТ-спецыяльнасці па ўласных прыярытэтах. Таму ў любым выпадку ў верасні павінен ісці на пары.

Многія абітурыенты прыехалі ў Мінск з рэгіёнаў. **Алёна ПАПРАЎКА** з мамай Аксанай — з Дзяржынска. Нягледзячы на высокі бал ЦТ, вырашылі падстрахавацца і накіравацца ў Мінск у апошні дзень, каб дакладна прайсці на бюджэт.

— Я толькі сёння прыму канчатковае рашэнне пра будучую спецыяльнасць, бо ў мяне шмат варыянтаў, — кажа дзяўчына. — Не магла выбраць тое, што больш па душы. Разважаю паміж прыборабудаўнічым факультэтам (спецыяльнасць «ювелірная справа») і факультэтам энергетычнага будаўніцтва (спецыяльнасці «цяплогазазабеспячэнне» і «водазабеспячэнне»). Па балах праходжу з вялікім запасам, але не ўпэўнена ў запатрабаванасці першай спецыяльнасці. Цяпло і вада патрэбны ўсім, таму працу павінна знайсці, а вось з ювелірнай справай сумняваюся. Хоць яна мне падаецца цікавейшай, ды і бал там ніжэйшы. На працягу некалькіх гадзін вызначымся і напішам заяву.

Прыём дакументаў скончыўся роўна а 18 гадзіне, пасля гэтага дзверы галоўнага корпуса зачынілі, а камісіі перасталі выдаваць абітурыентам дакументы з мэтай падачы на іншую спецыяльнасць. Але прыём заяў ад тых, хто знаходзіўся ў будынку, працягваўся да позняга вечара. Паводле новых патрабаванняў, інфармацыя аб дакументах, пададзеных у апошнія гадзіны да закрыцця прыёмных камісій, павінна быць даведзена да ведама абітурыентаў на наступны дзень (гэта значыць сёння) да 12 гадзін.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Фота Надзеі БУЖАН.

■ Надвор'е

І ўрэшце — цеплыня

У краіне на гэтым тыдні будзе ўмерана цёплае надвор'е, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Толькі ў другой яго палове ў паўднёвых рэгіёнах Беларусі тэмпература павысіцца (бліжэй да канца тыдня нават да плюс 30 градусаў), а таксама пройдуць кароткія лакальныя дажджы.

Сёння, у аўторак, пад уплывам малаактыўных франтоў у некаторых раёнах пройдуць дажджы. Ноччу і ранкам прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 градусаў цяпла, удзень будзе ад плюс 19 на поўначы да плюс 25 на поўдні.

У сераду чакаецца надвор'е пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным усходзе месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ізноў уначы і ранкам чакаецца слабы туман. Ноччу паветра прагрэецца да 7—12 градусаў, удзень будзе не вышэй за 17—24.

У чацвер ноччу ападкаў пераважна не прагназуецца, а вось удзень у некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і ранкам чакаецца слабы туман. Тэмпература ў цёмны час сутак — 7—14 цяпла, удзень — 19—26, а па паўднёвым захадзе да плюс 28.

У пятніцу ў некаторых раёнах магчымы кароткачасовыя дажджы, удзень навальніцы. Ноччу будзе 8—15 цяпла, днём — 20—27. Па паўднёвым захадзе абяцаюць яшчэ больш цёплае паветра: уначы — 16—18, удзень — плюс 28—30.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Факт

АДЧУЙ СЯБЕ ЧАЛАВЕКАМ-ПАВУКОМ

Дзве новыя спартыўна-забаўляльныя пляцоўкі адкрыліся ў Гомелі. Адна з іх размешчана на набярэжнай Сажа ў цэнтральным парку, а другая — у парку «Фестывальны».

Фота БЕЛТА.

Скейт-парк размешчаны непадалёк ад вяслярнай базы і мае некалькі спецыяльных прылад для трэніровак і трукаў з дошкай. Гомельскія скейтбардысты цяпер асвойваюць пляцоўку памерам 8 на 71 м. У дзень урачыстага адкрыцця тут правялі першыя спаборніцтвы.

У парку «Фестывальны» адкрылі першы ў Гомелі вяровачны гарадок. У ім два маршруты — для дзяцей і дарослых у залежнасці ад іх росту (ад 110 і 140 см адпаведна). Вышыня канструкцый — ад 2,5 да 4,5 метра. Тут ёсць падвесны мост, змейка з дошак і яшчэ каля дзесяці перашкод. Дарэчы, індывідуальны прадпрымальнік Дзмітрый Палійчук, які пабудаваў і абслугоўвае новую пляцоўку, сам прамысловы альпініст. Таму абяцае, што шпацыр па атракцыёне будзе бяспечным. Гарадок абсталяваны бесперапыннай страхоўкай, а праходжанне перашкод будзе пры абавязковай прысутнасці інструктара. У планах з часам дапоўніць гарадок хуткасным спускам і зрабіць прылады для заняткаў самых маленькіх — дзяцей ад 3 да 5 гадоў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

У БЕРАЗІНЕ ЗАГІНУЎ РАТАВАЛЬНІК

Трагедыя адбылася ноччу з нядзелі на панядзелак. У 0.14 на пульт дзяжурнага РАНС паступіла інфармацыя аб тым, што па вуліцы Мінскай гарыць прыватны дом.

Калі ратавальнікі прыбылі на месца падзей, адкрытым полымем гарэла веранда дома. Пасля таго як пачалося тушэнне пажару, прагрымеў выбух. Гэта ўзарваўся газавы балон.

— Прапаршчык унутранай службы Дзмітрый Няборскі ў гэты момант знаходзіўся на пазіцыі ствольшчыка за некалькі метраў ад дома, — паведамілі ў **прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — Адразу пасля выбуху калегі знайшлі яго на зямлі без прытомнасці і пачалі праводзіць рэанімацыйныя мерапрыемствы. Ратавальнік быў хутка дастаўлены ў бальніцу, дзе неўзабаве памёр...

Цяпер высвятляюцца ўсе абставіны трагедыі.

Дзмітрыю Няборскаму было 40 гадоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Працяг тэмы

ДВУХПАВЯРХОВІКІ НЕ АЦАЛЕЛІ

У пасёлку трактарнага завода замест іх узвядуць 5—7-павярховыя будынкі

Двухпавярховікі ў Трактарагорадзе чакаюць канчатковага вырашэння свайго лёсу.

Нядаўна «Звязда» пісала пра сітуацыю, якая склалася вакол пасёлка трактарнага завода ў сталіцы. Дзеячы турызму кансалідавана выступілі за тое, каб захаваць гэты ўтульны куток Мінска, што мае прысмак мінулай, па-свойму каларытнай эпохі. Аднак некалькі дамоў, пасля разгляду звароту, усё адно знеслі. Мяркуецца, што работа па зносе аварыйных будынкаў працягнецца.

Старшыня адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска Павел КАРАНЕВІЧ на сустрэчы, якая адбылася з мясцовымі жыхарамі ўжо пасля пачатку зносу, адзначыў:

— У цэлым захоўваецца архітэктура па каркасных вуліцах. Таму гістарычны воблік квартала захаваецца, калі мы кажам пра яго самабытнасць. Пры гэтым у квартале ёсць не толькі тыя дамы, якія прызнаюцца каштоўнымі для горада, але і тыя, што на сёння падлягаюць зносу. Захоўваецца частка будынкаў, якія ўтрымаюць цэльнасць архітэктуры. А вось на месцы знесеных дамоў будуць пабудаваныя новыя, не парушаючы кварталаў і вуліц. Яны будуць вышынёй 5—7 паверхаў і не павінны зашкодзіць знешняму выгляду квартала.

Меркаванні жыхароў, між іншым, падзяліліся. Ёсць тыя, хто з-за дрэнных цепласетак, адсутнасці рамонту мараць пра кватэры ў новабудоўлі. Але таго, што мясцовыя жыхары пасля зносу дамоў будуць жыць у кватэрах менавіта ў Трактарагорадзе, мясцовыя ўлады гарантаваць не могуць. Калі забудоўшчык будзе дзяржаўны, так, мясцовым выдзеляць кватэры на гэтым жа месцы. Але калі прыватны — гарантый няма. А хто будзе тут будаваць — дакладна не вядома, бо інвестара на пустыя пляцоўкі (а дакладней, руіны) пакуль няма. Адбываецца звычайная ачыстка тэрыторыі.

Мясцовых жыхароў, хто марыць пра захаванне свайго пасёлка, таксама нямала. Вось што расказала адна з іх, **Аліна БУНІС:**

— Мы набывалі кватэру менавіта ў гэтым раёне. Бо я сама выросла ў цэнтры горада на вуліцы Энгельса. Мой муж таксама рос у цэнтры, на праспекце Незалежнасці. Як кажуць рыэлтары, «сіндром сталінскай кватэры» — гэта дакладна пра нас. Бо мы надзвычай цэнім высокія столі і прастор кватэры. Мы паўгода займаліся пошукам жылля, а калі прыйшлі ў гэту ў пасёлку трактарнага завода, удваіх згодна кіўнулі галавой, што яна наша, і што мы хочам жыць у гэтым раёне. Якімі б вялікімі ні былі кватэры ў новабудоўлях, не заменіш дух Трактарагорада, мур у дзве з паловай цэглы, цеплыню нашага дома. Я за тое, каб квартал захаваўся ў такім выглядзе, які ёсць. Няхай бы інвестары перарабілі двухпавярховікі ў нешта. Бо Траецкае прадмесце, па сутнасці, таксама было «каробкамі»... Я жыву ў трохпавярховым доме, нас пакуль не зносяць, але ж я думаю, што гэта проста пытанне часу... Калі народ зразумее, што гэта фактычна цэнтр горада, дзве хвіліны да метро, — гэта вельмі прывабнае месца — ад ахвотных тут жыць адбою не будзе.

Жанчына расказала, што ў пасёлку яны жывуць ужо 14 гадоў і з тэхнічнымі праблемамі спраўляюцца. Той, хто своечасова сам клапаціўся пра сваю кватэру, і сёння мае добрае жыллё ў Трактарагорадзе. Але якім будзе яго далейшы лёс, пакажа час.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

■

Колькасць вакансій...

Фота БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гарадской службе занятасці на ўліку ў якасці беспрацоўных на пачатак года знаходзіліся 5,4 тысячы чалавек. Попыт наймальнікаў горада на кадры складаў 7,7 тысячы чалавек, а ўзровень беспрацоўя — 0,5% ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Гэта тое, што характарызуе рынак працы нашага горада.

«Мы не надта ўлічваем жаданне саіскальніка наконт атрымання новай прафесіі, а ў большай ступені арыентуемся на патрэбы рынку працы. Навошта нам рыхтаваць, напрыклад, сакратароў-рэферэнтаў або ліфцёраў, калі яны не патрэбныя гораду?»

За паўгода колькасць занятага насельніцтва ўзрасла да 1 063 600 чалавек (або на 2100 чалавек). Колькасць тых, хто знаходзіцца на ўліку беспрацоўных, знізілася да 4,3 тысячы чалавек (або на 1,1 тысячы чалавек). І, што немалаважна, попыт на кадры павялічыўся да 11,6 тысячы чалавек (+ 3,9 тысячы вакансій). А ўзровень беспрацоўя на 1 ліпеня знізіўся да 0,4%.

— І што гэтаму паспрыяла?

— Перш за ўсё, лічу, меры, звязаныя з рэалізацыяй Дэкрэта №3. Масавая кампанія па працаўладкаванні непрацуючых грамадзян дала свае вынікі.

Акрамя таго, мы паставілі перад сабой задачу як мага больш прыцягнуць работадаўцаў да супрацоўніцтва са службай занятасці. У тым ліку дзякуючы і гэтаму колькасць вакансій у нас узрасла з 7,7 тысячы да 11,6 тысячы.

Сёння, дарэчы, павышана адказнасць работадаўцаў пры звальненні людзей. Мы стараемся не дапусціць несанкцыянаваных звальненняў работнікаў. Наша задача, вядома, не забараніць звальняць — гэта не мера. Але мы стараемся ведаць аб кожным выпадку звальнення, каб своечасова «падхапіць» чалавека, аказаць яму дапамогу, калі ён мае ў ёй патрэбу. З гэтай мэтай мы праводзім маніторынг арганізацый наконт адтоку кадраў. І калі ўжо на тое пайшло, наймальнік таксама павінен задацца пытаннем: куды пойдуць гэтыя людзі, — такую задачу, у прыватнасці, паставіў перад прадпрыемствамі Прэзідэнт.

Апроч іншага, мы адкрылі кансультацыйныя пункты ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва для тых, хто шукае працу. Там, на месцы, разам з дапамогай нашых кансультантаў адначасова можа быць вырашана пытанне і з аказаннем матэрыяльнай дапамогі беспрацоўнаму: калі ён апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, зможа атрымаць кансультацыю юрыста і г. д. З 27 сакавіка там былі пракансультаваныя 860 мінчан.

З 23 сакавіка ў сталіцы працуе шматканальная гарачая тэлефонная лінія для садзейнічання ў атрыманні работы і інфармавання аб магчымасцях працаўладкавання.

— Якія яшчэ змены чакаюць мінчан, што звернуцца ў службу занятасці?

— У аддзелах працаўладкавання зараз арганізавана экспрэс-абслугоўванне. Пры гэтым для таго, каб атрымаць дапамогу, чалавеку неабавязкова рэгістравацца ў якасці беспрацоўнага.

Калі хтосьці адчувае складанасці з працаўладкаваннем, то ён можа першапачаткова атрымаць часовую працу. Для гэтага мы вызначылі 145 аб'ектаў, якія даюць гораду 945 працоўных месцаў, з іх 66 (або 460 працоўных месцаў) — для часовай занятасці, 79 (або 485 працоўных месцаў) — для ўдзелу ў аплатных грамадскіх работах. Сярод такіх аб'ектаў — Мінскзеленбуд, заапарк, батанічны сад і іншыя. Самае галоўнае — асобныя наймальнікі пасля часовага працаўладкавання гарантуюць пераход на пастаянную працу.

Іншая рэч, што не ўсім беспрацоўным патрэбна праца. Сярэдні партрэт сталічнага беспрацоўнага: мужчына прыблізна 42 гадоў з сярэдняй адукацыяй. Большасць такіх прэтэндэнтаў на працу не маюць ніякай спецыяльнасці альбо маюць працяглы перапынак у працы. А наймальнікі сёння просяць высокакваліфікаваных работнікаў. І калі ім патрэбны, напрыклад, токар, то яны шукаюць токара самага высокага разраду.

Наогул, доля працоўных месцаў па рабочых прафесіях і спецыяльнасцях на сённяшні дзень скараціласа. Яшчэ два гады таму такіх працоўных месцаў было да 72%, а сёння іх доля складае каля 50%. А колькасць вакансій з неквалiфікаванай працай знізілася да 600. Таму вакансіі вартаўніка, дворніка нарасхват.

І ёсць пэўны перакос, неадпаведнасць паміж тым, што просяць наймальнікі, і тым, што ім прапануюць нашы кліенты. У такім выпадку мы раім беспрацоўным прайсці навучанне і перанавучанне. Гэта датычыцца больш чым 40 прафесій і спецыяльнасцяў рознага спектра. Прычым мы сёння не надта ўлічваем жаданне саіскальніка наконт атрымання новай прафесіі, а ў большай ступені арыентуемся на патрэбы рынку працы. Навошта нам рыхтаваць, напрыклад, сакратароў-рэферэнтаў або ліфцёраў, калі яны не патрэбныя гораду?

Тэлефон шматканальнай гарачай тэлефоннай лініі для садзейнічання ў атрыманні работы — 369-88-29.

Яшчэ мы працуем пад канкрэтны заказ работадаўца. Напрыклад, мы шмат гадоў супрацоўнічаем з Мінтрансам. Рыхтуем для іх кіроўцаў тралейбусаў і трамваяў, вось і цяпер набіраем групу для навучання кіраванню трамваем. Ніяк не можам знайсці дастатковую колькасць кантралёраў грамадскага транспарту... Так, гэта напружаная, псіхалагічна няпростая праца, але там і зарплата прапануецца нядрэнная... Наогул, сярэдняя зарплата па наяўных вакансіях складае больш за 500 рублёў. Але, зноў жа, усё залежыць ад таго, што можа чалавек і як ён сябе праявіць.

— Што можна зрабіць, на ваш погляд, каб павысіць эфектыўнасць службаў занятасці?

— На жаль, ёсць людзі, якія звяртаюцца ў службу занятасці, мабыць, толькі для таго, каб атрымаць статус беспрацоўнага. У мяне на прыёме нядаўна быў адносна малады чалавек, якому выдалі 31 накіраванне на працаўладкаванне, і яму не падышла ні адна вакансія! Магчыма, частка такіх людзей займаюцца ценявым бізнесам, некаторыя жывуць за кошт таго, што маюць ва ўласнасці некалькі кватэр і здаюць іх... Працаўладкаваць чалавека, які не мае матывацыі да працы, вельмі складана.

Думаю, нам будзе карысна ўлічыць досвед Літвы. Там, калі беспрацоўны прыходзіць на прыём да спецыяліста службы занятасці, той вызначае яго матывацыю. Усіх кандыдатаў на працаўладкаванне «дзеляць» на «талентаў» (высокакваліфікаваныя спецыялісты), асоб з высокай матывацыяй да працаўладкавання, гатовых тут жа выйсці на працу, асоб з сярэдняй матывацыяй. І апошняя група ўключае беспрацоўных з нізкай матывацыяй да працы.

З апошнімі дзюма катэгорыямі працуе не толькі спецыяліст па працаўладкаванні, але і кансультант кар'еры, які праводзіць псіхалагічнае тэсціраванне і псіхалагічную кансультацыю. Такім чынам, з кандыдатамі з нізкай матывацыяй працуюць два спецыялісты, і гэта прыносіць свае вынікі: у краіны-суседкі высокая эфектыўнасць працаўладкавання — амаль 70% ад тых, хто звярнуўся. Таму і мы ўжо стараемся падключаць псіхолагаў і псіхалагічных кансультантаў.

У гэтым годзе сталічная служба занятасці будзе рэарганізавана. Цяпер у Мінску функцыянуе пяць міжраённых аддзелаў працаўладкавання. З верасня будзе працаваць тры аддзелы, якія не будуць прывязаныя тэрытарыяльна да адміністрацыйных раёнаў сталіцы. І любы чалавек незалежна ад таго, у якім раёне горада ён пражывае, зможа звярнуцца туды: пракансультавацца, зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага і атрымаць садзейнічанне ў працаўладкаванні. Акрамя гэтага, у Мінску будзе працаваць адзіны гарадскі цэнтр занятасці.

У цэлым хачу сказаць, што сёння ёсць перадумовы да павышэння попыту эканомікі горада на кадры і забяспечанасці працоўнымі месцамі тых, хто шукае працу. Ужо цяпер на кожнага афіцыйнага беспрацоўнага прыпадае 2,7 вакансіі, у той час як на пачатак года прыпадала толькі 1,1 вакансіі. І прыемна заўважыць, што ёсць попыт на спецыялістаў, бо гэта значыць — краіне патрэбны высокакваліфікаваныя кадры.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

• У тэму

Каго чакаюць на сталічным рынку працы?

Сярод найбольш запатрабаваных сталічнымі наймальнікамі рабочых кадраў — прадавец (366 вакансій), кухар (268), прыбіральшчык памяшканняў (237), санітар (181), муляр (190), тынкоўшчык (187), маляр (185), цяслярбетоншчык (170), арматуршчык (144), бетоншчык (144), швачка (132), кур'ер (102).

З ліку спецыялістаў найбольш запатрабаваныя ўрачы-спецыялісты (504), медыцынскія сёстры (978), выхавальнікі (178), інжынеры-праграмісты (161), фельчары-лабаранты (127), спецыялісты па продажы (79), рэнтгеналабаранты (75) і інш.

У найбліжэйшай перспектыве, як мяркуецца, таксама будуць запатрабаваныя рабочыя будаўнічых прафесій, рабочыя і інжынерныя кадры ў галіне машынабудавання, хімічнай прамысловасці, работнікі сферы гандлю, транспарту і сувязі, спецыялісты IT-сферы і ўсе спецыялісты, звязаныя з абслугоўваннем інфармацыйных сістэм.

Захаваецца высокі попыт на спецыялістаў па продажах, лагістаў, тэхнічных спецыялістаў, медыцынскіх работнікаў, фармацэўтаў, педагогаў, матэматыкаў.

• Карысна ведаць

Для тых, хто так і не знайшоў працу...

Тут важна задзейнічаць усе рэсурсы — гэта і гарадскія кірмашы вакансій, і дні прадпрыемства, якія праводзяцца штотыдзень на базе аддзелаў працаўладкавання, і інтэрнэт, і асабістыя кантакты, і размяшчэнне рэзюмэ, і зварот у дзяржаўную службу занятасці насельніцтва.

Інфармацыю аб магчымасцях працаўладкавання можна шукаць на інтэрнэт-партале Мінскага гарвыканкама, на сайтах камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, адміністрацый раёнаў, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, а таксама варта звяртаць увагу на аб'явы ў грамадскім пасажырскім транспарце, жылым фондзе, на інфармацыйных тумбах УП «Мінгардаведка» і інш.

У сталіцы з пачатку года ўжо прайшло 50 міні-кірмашоў вакансій і адзін агульнагарадскі кірмаш вакансій, а таксама 41 дзень прадпрыемства.

У ліпені плануецца працягнуць правядзенне інфармацыйных мерапрыемстваў для беспрацоўных грамадзян. Пройдзе больш як 20 міні-кірмашоў вакансій і дзён прадпрыемстваў. На іх, акрамя стасункаў з наймальнікамі, наведвальнікі аддзелаў працаўладкавання змогуць азнаёміцца з інфармацыяй аб сітуацыі на рынку працы, аплатных грамадскіх работах, наяўнасці свабодных працоўных месцаў у горадзе, атрымаць кансультацыі спецыялістаў службы занятасці насельніцтва.

Гран-пры не прысудзілі

А ў беларуса аж дзве прэміі і спецыяльны прыз!

Учора на канцэрце закрыцця фестывалю агучылі вынікі Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2017».

Улад СЫТНІК.

Ягор ШАРАНКОЎ.

Фота БЕЛТА.

Як і меркавалі вопытныя прадстаўнікі СМІ, сёлета журы вырашыла не прысуджаць Гран-пры конкурсу (20 тысяч долараў). Гэта было зроблена па прычыне адсутнасці розніцы ў балах паміж удзельнікамі, якія набралі найбольшую колькасць ачкоў. І па выніках галасавання членаў журы з двух удзельнікаў, якія набралі максімальную і прытым аднолькавую колькасць балаў, большасцю галасоў прынята рашэнне аб перавазе канкурсанта ад Украіны.

У выніку І прэмію — 15 000 долараў ЗША — атрымаў Улад СЫТНІК. ІІ прэмію — 10 000 долараў — Ягор ШАРАНКОЎ з Беларусі. ІІІ прэмію — 5000 долараў — уручылі Невене БОЖАВІЧ з Сербіі.

Акрамя гэтага, спецыяльную прэмію імя Уладзіміра Мулявіна за найлепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы, высокае выканальніцкае майстэрства атрымаў таксама наш зямляк Ягор ШАРАНКОЎ.

Яго ж і прадстаўніцу Расіі — Лілію ВЕЛЬТМАН — узнагародзілі спецыяльнымі прызамі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Цікава, што расіянка таксама атрымала спецыяльную ўзнагароду Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» — «Песня — шлях да садружнасці» — за высокае майстэрства ў захаванні нацыянальных традыцый. Адпаведна павязе дамоў і грашовую прэмію — 2000 долараў!

Нагадаем, старшынёй журы была папулярная спявачка і прадзюсар з Балгарыі Ярданка Хрыстава.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

РЭКОРД АД РЭЗЧЫКАЎ

«Звязда» ўжо анансавала рэкорд, які павінны былі ўсталяваць на «Базары» два рэзчыкі па дрэве з Літвы і Беларусі.

І вось пазаўчора (у нядзелю) іх сумесны твор — гіганцкую лыжку — афіцыйна абмералі. Нішто сабе атрымалася «лыжачка»: даўжыня больш за 5 метраў 94 сантыметры! А самая вялікая шырыня — каля 75 сантыметраў! Наконт вагі: калі 10 мужчын спрабавалі падняць лыжку, ледзь прыпаднялі.

Стваралі гэты цуд з асіны на працягу трох дзён. Колькі гадзін патрацілі дакладна, не падлічвалі, бо падчас моцных дажджоў не працавалі. Імёны майстроў упішуць у «Кнігу фестывальных рэкордаў». Аўтары — жыхар прыгарада Віцебска (з Рубы) Міхаіл Зянькоў і Віргіліюс Вайчунас. Беларус сцвярджае, што менавіта такой формы лыжкі выразалі яго продкі. Такім чынам, велікан — «класічны беларускі ўзор». Майстры падарылі свой твор гораду Віцебску. І на момант падрыхтоўкі гэтага артыкула яшчэ не было вырашана, дзе зойме дастойнае месца ўнікальны выраб умельцаў.

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

ШПАЦЫР ПА ФЕСТЫВАЛІ,

або Чаму журналіст уцякаў ад хлопца на хадулях?!

У адзін з вечароў на «Славянскім базары ў Віцебску» наш карэспандэнт прагуляўся па фестывальным горадзе.

На «Базары» практычна з раніцы да ночы жыццё, як гаворыцца, бурліць зусім не побач з Летнім амфітэатрам, галоўнай сцэнай. Цэнтр падзей — у раёне дырэкцыі. Яна знаходзіцца недалёка ад сімвала Віцебска — ратушы. Так што прыезджым знайсці «хлеба і відовішчаў» будзе нескладана. А тое, што «галоўнае» і самае цікавае на вуліцах менавіта там — не толькі маё меркаванне, а і тых, хто адказвае за «Базар». У прыватнасці, такую думку агучыў у інтэрв'ю кіраўнік дырэкцыі.

Менавіта на пешаходных вуліцах можна ўбачыць тое, што абавязкова прыемна здзівіць, пацешыць, запомніцца надоўга. І тут і там гандлююць, спяваюць, танцуюць. Непадалёк мастакі прадаюць свае работы і пішуць партрэты. Што датычыцца цэн на сувеніры і іншае, у параўнанні з мінулым годам, яны не павялічыліся.

А мо і вам, як і мне, сустрэнецца «Баба Яга» або дзяўчына з залатым тварам і рукамі — адна з майстроў вулічных прадстаўленняў? А мо вясёлая жанчына з шыльдачкай «Выйду замуж»? Можа,таксама ўбачыце выступ сапраўднага індзейца, які спявае і выконвае «шаманскія танцы» недалёка ад помніка Альгерду.

Як і ў папярэднія гады, шмат людзей каля павільёнаў і гандлёвых пляцовак раёнаў краіны. Тут вы можаце купіць вырабы народных умельцаў, паслухаць выступленні самадзейных артыстаў. І пашанцуе бясплатна пакаштаваць нацыянальныя беларускія стравы. Больш таго, калі спадабаецеся, нават могуць наліць «напой для дарослых». І спазнаць увесь «мацунак траў» зможаце, слухаючы выступленне гарманістаў, віртуозаў балалайкі з глыбінкі, дудароў... Я не выпіў, але паслухаў.

Рэкамендую прайсціся да «Лялечнага квартала». Спытайце гараджан, дзе ўсталявалі помнік старому Хатабычу, вам падкажуць. Там на вуліцы вы ўбачыце мімаў, скамарохаў на хадулях, казачных персанажаў. Папярэджваю, што адзін з «хадуноў» вельмі шкодны: абавязкова пастараецца абліць вас вадой з палівачкі. Аўтару гэтых радкоў даводзілася літаральна ўцякаць, каб артыст не абліў фотаапарат. Дарэчы, у Беларускім тэатры «Лялька», які стаў часовым домам для калектываў з розных краін, сёлета рэкордная колькасць спектакляў. У адзін з дзён іх было аж пяць! І гледачы, якія сыходзілі пасля спектакля, вымушаны былі пераадольваць паток людзей, якія заходзілі. Гэты «канвеер» асабіста мне запомніцца...

Падчас прагулкі вы можаце паназіраць за выступленнем тых, хто паказвае шоу з агнём, штукароў, артыстаў аўтарскай песні...

Нагадваю, што па добрай традыцыі пасля афіцыйнага закрыцця фэсту ёсць так званыя неафіцыйныя. Заўтра — 19 ліпеня — апошняе. Мо яшчэ паспееце прыехаць?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Шляхамі маладосці

Пад дэвізам «Беларусь — крыніца натхнення» ў Віцебску прайшлі мерапрыемствы Дня моладзі.

Ужо другі год падчас XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў горадзе ладзяцца імпрэзы, прысвечаныя Дню моладзі. Сёлета свята вырашылі падоўжыць: ініцыятыва Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі атрымала ў распараджэнне ўжо два дні. Арт-парад, спаборніцтва дыджэяў, танцавальны марафон, фестываль субкультур і фаершоу — Дзень моладзі прапанаваў гасцям «Славянскага базару» вельмі разнастайную праграму.

— Асаблівасць гэтага фестывалю — у імкненні аб'яднаць не толькі беларускую таленавітую моладзь, але і прадстаўнікоў іншых краін, — зазначыў **кіраўнік БРСМ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — Мы хочам, каб межы Дня моладзі пашыраліся і на фестываль прыязджала як мага больш падлеткаў. Сёння да нас далучыліся таленавітыя юнакі з Расіі, Украіны, Казахстана.

Сёлета на Дні моладзі з'явілася пляцоўка «Беларусь — наш родны дом», дзе сустрэліся прадстаўнікі розных нацыянальных аб'яднанняў.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.

■ За падзеяй

Вяртанне дадому

Прах мецэнаткі Магдалены Радзівіл перавезлі ў Мінск

Ініцыятыва, агучаная летась, калі адзначалася 155-годдзе з дня нараджэння княгіні, прадстаўнікамі знакамітага роду князямі Мацеем і Мікалаем Радзівіламі, сёлета ўвасобілася ў жыццё.

Імя Магдалены Радзівіл сапраўды зорнае для беларускай культуры і літаратуры. Яна (у ліку нямногіх прадстаўнікоў магнацкіх родаў) адкрыта называла сябе беларускай, падтрымлівала выдавецкую суполку «Загляне сонца і ў наша аконца», Беларускае выдавецкае таварыства. Дзякуючы яе фінансаваму спрыянню пабачылі свет кнігі Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло. А прыбытак ад продажу аднаго з самых каштоўных яе брыльянтавых калье — а гэта 15 тысяч долараў (на той час — вельмі вялікія грошы) — быў перададзены кляштару айцоў-марыянаў у Друі.

На жаль, у 1918 годзе Магдалена Радзівіл вымушана была эміграваць з Беларусі. Жыла ў Польшчы, Літве, Германіі. З 1932 года — у швейцарскім Фрыбуры, дзе і памерла ў 1945 годзе ва ўзросце 83 гадоў. Вядома, што яна ўсё жыццё ўспамінала пра Мінск, марыла жыць тут. Але ў варунках ваенных падзей XX стагоддзя вяртанне ў Беларусь было немагчымае.

Яшчэ дакладна не вядома, дзе будзе перазахаваны прах мецэнаткі. Канчатковае рашэнне мусяць днямі прыняць кіраўнік касцёла ў Беларусі архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі, і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Але найбольш лагічным і правільным бачыцца ідэя перазахавання праху ў касцёле Святых Сымона і Алены: тут ужо знайшлі апошні прытулак многія знакавыя дзеячы нашай культуры. Таксама варта памятаць, што кватэра Магдалены Радзівіл размяшчалася ў свой час у адным з дамоў на плошчы Незалежнасці, акурат каля Чырвонага касцёла.

Марына ВЕСЯЛУХА. *vesialuha@zviazda.by*

■ Кітайскі вектар

АД СКАРЫНЫ ДА СУЧАСНАСЦІ

У Кітаі ў Другім Пекінскім дзяржаўным універсітэце замежных моў працуе цэнтр культуры Беларусі.

Тут не абмяжоўваюцца імпрэзамі, мерапрыемствамі з нагоды беларускіх свят. Цікаўныя да Беларусі студэнты, магістранты, выкладчыкі рэалізуюць іншыя праекты, звязаныя з даследаваннямі ў галіне беларусаў культуры, мастацтва, літаратуры. Адзін з іх — стварэнне серыі кніг, звязаных з біяграфіямі знакамітых асоб Беларусі. Першы зборнік, над якім у якасці аўтараў працуюць магістранты факультэта рускай мовы (зразумела, асобнага факультэта беларускай мовы і літаратуры ва ўніверсітэце не існуе), — кніга пра беларускіх пісьменнікаў. Пад адной вокладкай сабраны нарысы пра жыццё і творчасць майстроў прыгожага пісьменства з розных часін.

— У якасці асоб, чыю творчасць, чыю жыццёвую біяграфію мы разглядаем, — расказвае **доктар філалагічных навук спадарыня Чжан ХУЭЙЦІНЬ,** — мы выбралі Францыска Скарыну, Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Святлану Алексіевіч. Акрамя гэтага, мы плануем правесці ў лістападзе міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную Беларусі. Спадзяёмся на ўдзел у ёй і навукоўцаў, студэнтаў з Мінска і гарадоў вашай краіны.

Варта нагадаць, што ў Кітаі раней выходзілі асобныя кнігі Янкі Купалы і Якуба Коласа. З 1990 года выдадзены ці не ўсе кнігі лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч. «Цынкавыя хлопчыкі» ў перакладзе Гаа Мана перавыдаваліся, дарэчы, неаднойчы. Перакладчык і каліграф Гаа Ман у розныя гады намаляваў партрэты Янкі Купалы, Якуба Коласа, Святланы Алексіевіч.

Мікола БЕРЛЕЖ

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк» Открытое акционерное общество
Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 95А
тел. (017) 389 36 36, факс (017) 389 36 37
office@fransabank.by www.fransabank.by

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной финансовой отчетности, и аудиторское заключение за 2016 год

ОБОБЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2016 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

	31 декабря 2016 года	31 декабря 2015 года
АКТИВЫ		
Денежные средства и счета в Национальном банке Республики Беларусь	10,207	15,409
Производные финансовые активы	-	73
Средства в банках	1,901	2,937
Кредиты, предоставленные клиентам	53,163	51,887
Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи	9,283	9,464
Инвестиции, удерживаемые до погашения	32,947	23,094
Активы по текущему налогу на прибыль	36	319
Активы по отложенному налогу на прибыль	-	183
Основные средства и нематериальные активы	17,306	17,013
Прочие активы	386	442
ИТОГО АКТИВЫ	**125,229**	**120,821**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		
Производные финансовые обязательства	-	9
Средства банков	19,371	21,451
Средства клиентов	42,429	40,923
Обязательства по текущему налогу на прибыль	18	-
Обязательства по отложенному налогу на прибыль	21	-
Прочие обязательства	352	315
Субординированный заем	19,494	22,796
Итого обязательства	**81,685**	**85,494**
КАПИТАЛ		
Уставный капитал	49,253	44,581
Фонд переоценки финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	-	(53)
Непокрытый убыток	(5,709)	(9,201)
Итого капитал	**43,544**	**35,327**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	**125,229**	**120,821**

ОБОБЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ ИЛИ УБЫТКЕ И ПРОЧЕМ СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2016 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2016 года		Год, закончившийся 31 декабря 2015 года
Процентные доходы	13,637		12,724
Процентные расходы	(4,233)		(5,515)
Чистый процентный доход до восстановления/(убытков от обесценения) по активам, по которым начисляются проценты	9,404		7,209
Восстановление резервов под обесценение/(убытки от обесценения) по активам, по которым начисляются проценты	539		(3,859)
Чистый процентный доход	**9,943**		**3,350**
Чистая прибыль по операциям с иностранной валютой	3,441		201
Чистая прибыль по операциям с производными финансовыми инструментами	44		5,968
Комиссионные доходы	2,172		2,592
Комиссионные расходы	(338)		(271)
Формирование резервов по прочим операциям	24		(19)
Прочие доходы, нетто	153		246
Чистые непроцентные доходы	**5,496**		**8,717**
Операционные доходы	15,439		12,067
Операционные расходы	(9,433)		(8,131)
Прибыль до налогообложения	6,006		3,936
Расходы по налогу на прибыль	(607)		(600)
Чистая прибыль за год	**5,399**		**3,336**
Прочий совокупный доход			
Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в состав прибылей или убытков			
Изменение справедливой стоимости финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	-		(53)
Реклассификация по финансовым активам, имеющимся в наличии для продажи, реализованным в течение года	(53)		-
Прочий совокупный доход	**53**		**(53)**
Итого совокупный доход	**5,42**		**3,283**

ОБОБЩЕННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В СОБСТВЕННОМ КАПИТАЛЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2016 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

	Уставный капитал	Фонд переоценки инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	Непокрытый убыток	Итого капитал
31 декабря 2014 года	**44,581**	**-**	**(11,140)**	**33,441**
Прибыль за год	-	-	3,336	**3,336**
Фонд переоценки инвестиций, имеющихся в наличии для продажи	-	(53)	-	**(53)**
Дивиденды объявленные	-	-	(1,397)	**(1,397)**
31 декабря 2015 года	**44,581**	**(53)**	**(9,201)**	**35,327**
Внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	4,672	-	-	**4,672**
Чистая прибыль за год	-	-	5,399	**5,399**
Прочий совокупный доход	-	53	-	**53**
Дивиденды объявленные	-	-	(1,907)	**(1,907)**
31 декабря 2016 года	**49,253**	**-**	**(5,709)**	**43,544**

ОБОБЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2016 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

	Год, закончившийся 31 декабря 2016 года	Год, закончившийся 31 декабря 2015 года
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Прибыль до налогообложения	6,006	3,936
Корректировки		
(Восстановление)/Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты	(539)	4,032
(Восстановление)/Формирование резервов по прочим операциям	(24)	19
Изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов	(9)	(64)
Амортизация основных средств и нематериальных активов	700	788
Чистый убыток от выбытия основных средств, нематериальных активов и прочего имущества	132	8
Курсовые разницы, нетто	(149)	4,029
Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов	1,136	(1,786)
Чистая прибыль от выбытия финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	3	(5)
Чистое изменение прочих начисленных доходов и расходов	(3)	(112)
Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств	7,253	10,845
Изменение операционных активов и обязательств		
(Увеличение)/уменьшение операционных активов		
Минимальные обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь	(14)	122
Производные финансовые инструменты	73	10,617
Средства в банках	(698)	-
Кредиты, предоставленные клиентам	(4,640)	13,709
Прочие активы	376	706
Активы, удерживаемые до погашения	(2,073)	-
Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи	(446)	-
Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств		
Средства банков	3,215	(15,794)
Средства клиентов	3,863	4,185
Прочие обязательства	89	(191)
Приток денежных средств от операционной деятельности до налогообложения	6,998	24,199
Налог на прибыль уплаченный, нетто	(210)	(1,246)
Чистый приток денежных средств от операционной деятельности	6,788	22,953
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Приобретение основных средств и нематериальных активов	(1,125)	(162)
Погашение и продажа инвестиций в наличии для продажи	11,900	11,774
Приобретение финансовых активов, имеющихся в наличии для продажи	(11,758)	(18,719)
Приобретение активов, удерживаемых до погашения	(113,531)	(29,130)
Погашение активов, удерживаемых до погашения	103,714	12,456
Чистый отток денежных средств от инвестиционной деятельности	(10,800)	(23,781)
ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Дивиденды уплаченные	(1,907)	(1,397)
Выпуск облигаций	2,349	5,450
Погашение облигаций	(2,349)	(5,450)
Чистый отток денежных средств от финансовой деятельности	(1,907)	(1,397)
ЧИСТОЕ СОКРАЩЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ	(5,919)	(2,225)
Влияние изменения курсов иностранных валют на денежные средства и их эквиваленты	(350)	4,367
Влияние инфляции на монетарные активы и обязательства	-	-
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало периода	17,900	15,758
ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец периода	11,631	17,900
	2016 год	**2015 год**
Дополнительная информация		
Проценты выплаченные	(4,304)	(4,233)
Проценты полученные	14,844	13,637

В 2016 году неденежными операциями являлись: перевод средств со счета по учету субординированного займа в уставный фонд – 4,672 тыс. рублей. В 2015 году неденежными операциями являлись: отступное, полученное в счет исполнения обязательств по кредиту, – 171 тыс. рублей.

От имени Правления Банка:

Председатель Правления
А. В. Игнатов

30 июня 2017 года
Минск

Главный Бухгалтер
Л.Б. Падёнова

30 июня 2017 года
Минск

УНП 100755021

Deloitte.

Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»
ул. К. Цеткин, д. 51А, 13-й этаж
Минск, 220004
Республика Беларусь

Тел. +375 (17) 309 99 00
Факс +375 (17) 309 99 01
www.deloitte.by

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ПУБЛИКУЕМОЙ ОБОБЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Акционерам и Совету директоров «Франсабанк» Открытого акционерного общества

Мнение

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность, состоящая из обобщенного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2016 года, обобщенных отчетов о прибыли или убытке и прочем совокупном доходе, об изменениях в собственном капитале и о движении денежных средств за 2016 год, составлена на основе аудированной финансовой отчетности «Франсабанк» Открытого акционерного общества (далее – «ОАО «Франсабанк или «Банк») за 2016 год, подготовленной в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности. Мы выразили аудиторское мнение с оговоркой об указанной финансовой отчетности в нашем заключении от 30 июня 2016 года.

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая обобщенная финансовая отчетность согласуется во всех существенных аспектах с аудированной финансовой отчетностью, подготовленной в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, на основании критериев, приведенных в Инструкции «О раскрытии информации о деятельности банка, открытого акционерного общества «Банк Развития Республики Беларусь», небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга», утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 января 2013 года №19 (далее – «Инструкция №19»). Однако публикуемая обобщенная финансовая отчетность искажена в той же степени, что и аудированная финансовая отчетность ОАО «Франсабанк» за 2016 год.

Публикуемая обобщенная финансовая отчетность

В публикуемой обобщенной финансовой отчетности не содержится вся необходимая информация, подлежащая раскрытию в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с публикуемой обобщенной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности не заменяет ознакомление с аудированной финансовой отчетностью и аудиторским заключением по данной отчетности. В соответствии с требованиями Инструкции №19 Банк размещает в полном объеме годовую финансовую отчетность, составленную в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности, вместе с аудиторским заключением, составленным по результатам ее аудита, на своем интернет-сайте.

Аудированная финансовая отчетность и аудиторское заключение по данной отчетности

Мы выразили аудиторское мнение с оговоркой об аудированной финансовой отчетности в нашем заключении от 30 июня 2017 года. Основанием для выражения мнения с оговоркой стало неотражение Банком в финансовой отчетности корректировки балансовой стоимости административного здания, являющегося объектом основных средств, с балансовой стоимостью 14,332 тыс. рублей, до его возмещаемой стоимости, что является отклонением от требований МСФО (IAS) 36. Если бы обесценение было отражено в финансовой отчетности, это привело бы к уменьшению балансовой стоимости основных средств и капитала по состоянию на 31 декабря 2016 года и прибыли до налогообложения за 2016 год на 4,504 тыс. рублей.

Заключение по аудированной финансовой отчетности также включает информацию о ключевых вопросах аудита. Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, были наиболее значимыми для аудита финансовой отчетности за отчетный период.

Ответственность руководства за публикуемую обобщенную финансовую отчетность

Руководство отвечает за подготовку публикуемой обобщенной финансовой отчетности на основе аудированной годовой финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции №19.

Ответственность аудитора

Наша ответственность заключается в выражении мнения о том, согласуется ли во всех существенных аспектах публикуемая обобщенная финансовая отчетность с аудированной финансовой отчетностью. Мнение выражено на основании процедур, выполненных в соответствии с Международным стандартом аудита («МСА») 810 (пересмотренным) «Задания по предоставлению заключения об обобщенной финансовой отчетности».

30 июня 2017 года
г. Минск, Беларусь

И. о. Генерального директора
Иностранного унитарного
предприятия «Делойт и Туш»

М. М. Бабицкая
Квалификационный аттестат аудитора
№ 0001775 от 22 декабря 2009 года,
выданный Министерством финансов
Республики Беларусь

Свидетельство №51 о соответствии
квалификационным требованиям для
осуществления аудиторской деятельности в банковской системе
от 23 октября 2010 года

Deloitte.

Аудитор
Иностранного унитарного
предприятия «Делойт и Туш»

Д. А. Бекешко
Квалификационный аттестат аудитора
№ 0002114 от 27 июня 2013 года,
выданный Министерством финансов
Республики Беларусь

Свидетельство №71 о соответствии
квалификационным требованиям для
осуществления аудиторской деятельности в банковской системе
от 9 октября 2013 года

Скраў і грошы, і сейф

Супрацоўнікамі ўпраўлення крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з аператыўнікамі Маскоўскага РУУС сталіцы затрыманы 48-гадовы расіянін, які здзейсніў крадзеж сейфа і буйной сумы грашовых сродкаў з офіса, размешчанага ў адным са сталічных бізнес-цэнтраў па вуліцы К. Цэткін.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў было ўстаноўлена, што затрыманы ўжо раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за здзяйсненне маёмасных злачынстваў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. У бізнес-цэнтры ён выбраў адзін з офісаў, які быў размешчаны на дзявятым паверсе, і пранік у яго, пашкодзіўшы дзвярны замок. У памяшканні офіса мужчына ўзламаў два буйнагабарытныя сейфы і выкраў іх змесціва — 11 020 долараў ЗША і больш за 34 тысячы рублёў. Яшчэ адзін сейф (невялікага памеру) скінуў уніз праз акно, а затым забраў яго, сыходзячы з месца здзяйснення злачынства. У выкрадзеным сейфе знаходзілася 200 рублёў, паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама.

У дачыненні да зламысніка заведзена крымінальная справа за крадзеж. Затрыманаму пагражае адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 12 гадоў. Выкрадзеныя грашовыя сродкі ён выдаткаваў на куплю дарагой машыны.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

КАРАНІ і КРОНЫ

7

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 5-6 (21-22)

■ Тэма нумара

НЕ ЗАБЛЫТАЦЦА Ў «ПАРАСОНІКАХ»

Чаму баршчэўнік Сасноўскага заняў вялікія тэрыторыі ў нашай краіне, і якія яго сабраты нясуць для людзей не пагрозу, а карысць

Фота Ірыны СЫСОЙ.

Баршчэўнік... Большасць з нас гэта слова сёння палохае. Але не ўсё так страшна, як нам здаецца на першы погляд. Проста трэба ведаць «ворага ў твар». І не блытаць яго з падобнымі, але зусім няшкоднымі раслінамі.

НА БОРШЧ — У САМЫ РАЗ

На сенажацях, па берагах рэк і ручаёў, па лясных узлесках і палянах, у хмызняках, на прыдарожных лугавінах, чыгуначных насыпах і па разнастайных пустазельных месцах улетку можна сустрэць баршчэўнік сібірскі (Heracleum sibiricum L.). Распаўсюджаны ён у Цэнтральнай Еўропе, Сярэдняй Расіі, Пе-радкаўказзі, Заходняй Сібіры, Крыме і Казахстане.

У нашай краіне баршчэўнік сібірскі з'яўляецца звычайнай раслінай, якую ў летні перыяд можна сустрэць у шыракалістых лясах і па іх узлесках, хмызняках, палянах, абочынах дарог. Толькі людзі звычайна праходзяць міма, не звяртаючы ўвагі на гэту даволі цікавую расліну. Сцябло ў яе рабрыстае, цвёрдаапушанае, вышынёй да 60—100 см. Складанай будовы лісце можа быць даволі буйным, часам дасягаючы паўметра. Зверху лісце дробна шурпата-апушанае. Суквецце — складаны парасонік з зеленавата-жоўтымі кветкамі. Цвіце гэты від баршчэўнікаў у чэрвені-ліпені, а пладаносіць да верасня. Сярод шматлікіх іншых парасонавых раслін баршчэўнік сібірскі вылучаецца рэзкім пахам.

У адрозненне ад яго сабратаў — гіганцкіх баршчэўнікаў, якія дастаўляюць нам сур'ёзныя праблемы, — баршчэўнік сібірскі мае істотнае гаспадарчае значэнне, з'яўляючыся раслінай і ядомай, і лекавай. Ён багаты на аскарбінавую кіслату (да 0,215%), карацін, цукры, мікраэлементы і амінакіслоты. У невялікай колькасці ўтрымлівае і непажаданыя для нас злучэнні фуракумарынавага шэрагу.

Дзякуючы багатаму хімічнаму саставу, баршчэўнік сібірскі здаўна выкарыстоўваецца чалавекам у ежу, а таксама ў якасці лекавай расліны.

Раней людзі ўжывалі ў ежу маладыя сцябліны, лісце і карэнішча баршчэўніка сібірскага. Ачышчаныя ад скуркі сцябліны па смаку крыху нагадваюць агуркі. Іх можна выкарыстоўваць для салатаў, а таксама адварваць ці смажыць. Часам сцябліны соляць ці марынуюць.

Маладое лісце ўжываецца для падрыхтоўкі салатаў, пюрэ і гарніраў. А вось для баршчу лепш падыходзяць маладыя карэнішчы. Яны даволі салодкія і цалкам замяняюць шматлікую гародніну. Карэнішчы таксама можна марынаваць, саліць і сушыць.

Даўней баршчэўнік сібірскі шырока выкарыстоўваўся і ў народнай медыцыне. Водны настой травы і адвар каранёў баршчэўніка сібірскага валодаюць супрацьзапаленчым, абязбольвальным, вяжучым, супрацьспазматычным, антысептычным дзеяннямі, а таксама паляпшаюць працэсы стрававання.

Вядома, некалькі палохае ўтрыманне ў гэтай расліне фуракумарынаў — рэчываў, небяспечных для нашага здароўя. Аднак тут іх не так шмат, як у чужаземных для нашай зямлі гіганцкіх баршчэўнікаў...

ПУСТАЗЕЛЛЕ КРОЧЫЦЬ ПА ЕЎРАЗІІ

Гіганцкімі іх завуць за вышыню кветаноса, які можа вырастаць да 5 метраў у вышыню. Лісты ў некаторых відаў гэтых баршчэўнікаў перавышаюць у шырыню 1 і нават 1,5 м!

Велізарных памераў у перыяд цвіцення дасягае і парасонік. Цэнтральны можа быць да 80 см у дыяметры, а па баках — менш буйныя. У спрыяльных умовах адна расліна можа ўтвараць да 20 тысяч і больш насення, якое даволі лёгка распаўсюджваецца на значныя адлегласці. У літаратуры апісаны выпадкі, калі на адной расліне налічвалі звыш 100 тысяч насення!

На тэрыторыі нашай краіны сустракаюцца некалькі відаў гіганцкіх баршчэўнікаў. Але найбольш распаўсюджаным сёння лічыцца баршчэўнік Сасноўскага (Heracleum sosnowskyi Manden). Гэта горна-лясны і субальпійскі лугавы эндэмік, які ў натуральных умовах расце на Паўночным Каўказе, у Закаўказзі і Турцыі. З-за дзейнасці чалавека гэты від у наш час шырока распаўсюджваецца па тэрыторыі Усходняй Еўропы і Заходняй Сібіры.

На тэрыторыі Беларусі вывучэнне гіганцкіх баршчэўнікаў у якасці кармавых раслін было пачата ў другой палове XX ст. Ужо ў 60—70-я гады баршчэўнік Сасноўскага быў адабраны як сіласная культура і рэкамендаваны для вырошчвання на сельскагаспадарчых землях. Аднак вырошчваўся ён нядоўга, і землі з баршчэўнікам былі пакінутыя. Але ўмовы для яго росту аказаліся спрыяльнымі. З'яўляючыся чужародным для нас відам, у якога няма канкурэнтаў і практычна адсутнічаюць ворагі, баршчэўнік пачаў актыўна распаўсюджвацца па краіне.

У наш час гэты від актыўна засяляе абочыны дарог, закінутыя палі, пусткі, хмызнякі, землі пад ЛЭП, пасяляецца ў парках і скверах, на гарадскіх прагалінах. Вельмі часта баршчэўнік можна сустрэць па лясных участках уздоўж ручаёў і невялікіх лясных рэк, дзе ён утварае даволі шчыльныя зараснікі. З'яўленню яго на гарадскіх газонах і ў дварах, асабліва ў новабудоўлях, спрыяе занос насення з заражаным ім грунтам. У глебе гэта насенне можа захоўваць усходжасць не адзін год! На тэрыторыі краіны назіраецца ўжо ўкараненне баршчэўніку пад полаг лясоў, дзе праводзіць мерапрыемствы па барацьбе з гэтым небяспечным відам вельмі складана.

У ПААЗЕР'І — ШМАТ, А НА ПАЛЕССІ — МАЛА

Паводле інфармацыі Дзяржаўнага кадастра раслiннага свету Рэспублікі Беларусь, гіганцкія баршчэўнікі ў наш час на тэрыторыі краіны распаўсюджаны нераўнамерна. Найбольш актыўна яны засяляюць землі Паазер'я.

Самыя буйныя папуляцыі небяспечнага баршчэўніка на поўначы краіны зарэгістраваны ў Браслаўскім, Ушацкім і Віцебскім раёнах, дзе на асобных тэрыторыях яны могуць займаць да 100 га. Буйны цэнтр распаўсюджання гэтага віду на пачатку XXI стагоддзя быў выяўлены і на тэрыторыі Мінскага ўзвышша. Аднак, дзякуючы распрацаваным рэкамендацыям і рэалізаваным мерапрыемствам, яго плошчы тут істотна скараціліся. У паўднёвых рэгіёнах баршчэўнік не ўтварае буйныя папуляцыі, а на Палессі плошча, якую ён займае, у наш час невялікая.

Паколькі баршчэўнік Сасноўскага з'яўляецца небяспечнай інвазіўнай раслінай, да таго ж даволі агрэсіўнай у натуральных умовах, для барацьбы з ім распрацаваны шырокі спектр мерапрыемстваў, які ўключае як агратэхнічныя прыёмы, так і ўжыванне хімічных сродкаў барацьбы. Дзякуючы праведзенай рабоце, у цяперашнім дзесяцігоддзі плошча распаўсюджання баршчэўніка на тэрыторыі Беларусі некалькі зменшылася.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ПРАСКАНІРУЙЦЕ ПРАДУКТЫ!

Ініцыятыўны інжынер з Мінска спрасціў жыццё беларусаў, якія імкнуцца ўжываць здаровую ежу: ён стварыў мабільную праграму, што распазнае састаў прадуктаў харчавання

Спецыяльны сканер устанавіць на смартфон даволі проста: трэба спампаваць у медыямаркеце праграму «Howl». А каб скарыстацца ёй, дастаткова паднесці камеру мабільнага тэлефона да штрых-кода тавару — карыстальнік адразу атрымае інфармацыю пра састаў прадукту, патэнцыйна небяспечныя і карысныя кампаненты ў ім, а яшчэ — аб рэкамендаванай дзённай порцыі.

Мабільная праграма таксама вызначае рэйтынг дружалюбнасці прадукту, што значна спрашчае жыццё пакупніку.

— Стварыць такую мабільную праграму я вырашыў, таму што сам увесь час сутыкаўся з праблемай выбару. Дробны шрыфт, якім звычайна наносіцца на ўпакоўку састаў прадуктаў, і пастаянны дэфіцыт часу прымусілі мяне дзейнічаць. Я хацеў купляць здаровыя прадукты, гатовы быў нават пераплачваць за якасць, але разбірацца ва ўсіх слоічках-пачачках, якія стаяць на прылаўках, было няпроста, — расказвае пра прычыну стварэння мабільнага сканера яго **аўтар Аляксей КОЗЕЛ.**

Такія сканеры існуюць у краінах Еўропы, аднак у нашых крамах яны рэдка працуюць ды і «адгукаюцца» на вельмі невялікую колькасць тавараў, у асноўным на тыя, што трапілі на прылаўкі з-за мяжы. Гэтая ж праграма змяшчае інфармацыю аб 30 тысячах прадуктаў, якія можна купіць у беларускіх крамах. Важна было не проста апісаць састаў, але і даць карыстальніку механізм хуткай і зразумелай ацэнкі, які ўключаў бы ў сябе максімум інфармацыі. У цэлым на ацэнку дружалюбнасці прадукту паўплывалі кампаненты і энергетычная каштоўнасць. Аналіз усёй гэтай інфармацыі — вельмі працаёмкі і працяглы працэс. Стваральнік праграмы прызнаецца, што ў адзіночку ён не справіўся б — дапамагалі ўсе, каму спадабалася гэтая ідэя.

— Толькі ўявіце: збор, апрацоўка і праверка інфармацыі з упаковак прадуктаў занялі каля чатырох месяцаў! У гэтай рабоце нам дапамаглі работнікі адной сеткі сталічных гіпермаркетаў. Акрамя таго, неабходна было прааналізаваць інфармацыю аб кампанентах, аб іх карысці і шкодзе. Таму мы шмат чыталі навуковых артыкулаў, даведнікаў, вывучалі актуальную еўрапейскую інфармацыю — хацелася зрабіць глыбокі аналіз з выкарыстаннем аўтарытэтных крыніц.

— Разлічыць аптымальную здаровую порцыю нам дапамагаў захоплены тэмай харчавання доктар, кандыдат медыцынскіх навук Андрэй Белавешкін, — расказвае Аляксей Козел. — Вось так і атрымалася сабраць каманду з чалавек дваццаці, якія таксама цікавяцца гэтай тэмай.

Пакуль збіралі і аналізавалі базу аб саставе прадуктаў, адкрыліся цікавыя факты. Напрыклад, шматлікія вытворцы не цураюцца крычаць пра карысць прадукту пры наяўнасці вельмі сумнеўных кампанентаў — тых жа транстлушчаў і вялікай колькасці цукру, адзначае аўтар праграмы.

Вось і атрымліваецца, што на этыкетцы напісана «100% карысці» або «Толькі карысныя кампаненты», а па факце — усё наадварот. Самае цікавае, што асабліва часта грашаць гэтым тыя вытворцы, якія імкнуцца трапіць на паліцы са здаровым харчаваннем. Дарэчы, мабільная праграма не проста дае пакупніку парады з серыі «бяры / не бяры», але і расказвае больш падрабязна пра кожны з кампанентаў. Гэта дазваляе рабіць усвядомлены выбар, грунтуючыся на поўнай інфармацыі і магчымых рызыках для здароўя.

Робячы пакупкі, важна звяртаць увагу на тэрмін прыдатнасці прадуктаў. Чым ён даўжэйшы, тым, хутчэй за ўсё, у прадукце больш сінтэтычных кампанентаў, не заўсёды карысных для нашага здароўя. Не лішнім будзе глядзець і на вытворца: мясцовыя прадукты лічацца больш дружалюбным выбарам, таму пры іншых роўных якасцях варта аддаваць перавагу ім. І, вядома, упакоўка. У ідэале яе не павінна быць шмат, і лепш падтрымліваць вытворцаў, якія выкарыстоўваюць тару, прыгодную для перапрацоўкі, напрыклад шкляную, і ігнараваць тых, чыя ўпакоўка адразу ж апынецца на сметніку. Мабільная праграма мае яшчэ адзін бонус: яна паведамляе аб дзеючых зніжках у крамах, што дазваляе загадзя спланаваць пакупкі, зыходзячы з патрэб, і не набываць больш, чым насамрэч трэба.

Вольга АСТАПОВІЧ.

НЕ ЗАБЛЫТАЦЦА Ў «ПАРАСОНІКАХ»

ЯК ЗМАГАЦЦА З ІНВАЗІЯЙ?

✓ Паколькі асноўным спосабам рассялення баршчэўніку з'яўляецца распаўсюджанне яго насення, то ў мэтах барацьбы з непажаданай раслінай неабходна абмяжоўваць фарміраванне апошняга. Для гэтага рэкамендуецца скошваць расліны, не дапускаючы цвіцення і ўтварэння насення.

✓ На невялікіх участках магчыма выкопванне раслін або падсяканне іх сцёблакаранёў (зрэзка верхняй часткі ў глыбіню да 15 см) уручную. Там жа можа праводзіцца апрацоўка зараснікаў баршчэўніку гербіцыдамі, дазволенымі да ўжывання дзеючым беларускім заканадаўствам.

✓ Эфектыўнае залужванне ўчасткаў шматгадовай травой пасля ўжывання асноўных спосабаў знішчэння раслін баршчэўніку.

✓ На стадыі праектавання будаўнічых аб'ектаў неабходна правяраць грунт на засмечанасць яго насеннем баршчэўніку.

✓ Важную ролю таксама мае інфармаванасць насельніцтва пра меры засцярогі пры кантакце з раслінамі баршчэўніку і метадах барацьбы з ім.

І ВОРАГ БЫВАЕ КАРЫСНЫМ

І ўсё ж, нягледзячы на тое, што гіганцкія баршчэўнікі — расліны небяспечныя і непажаданыя, яны маюць і шэраг станоўчых якасцяў. Па-першае, гэта добрыя меданосы. У квітнеючых парасоніках і сцёблах баршчэўнікаў жывуць шмат розных насякомых, якія з'яўляюцца кормам для птушак. Паядаюцца гэтыя расліны некаторымі жывёламі. Менавіта таму ў месцах натуральнага вырастання яны не ўтвараюць гіганцкіх зараснікаў. А ў нас расліну ўпадабалі козы. Але ў якасці кармавой культуры для кароў баршчэўнік не падыходзіць, паколькі малако набывае непрыемны смак. Ды і могуць быць праблемы са здароўем ад такога малака. Затое, дзякуючы высокаму ўтрыманню цукра ў расліне, некаторыя ўмельцы навучыліся выкарыстоўваць яго для вырабу хатняй алкагольнай прадукцыі.

У ранейшыя часы гіганцкія баршчэўнікі выкарыстоўваліся ў батанічных садах Еўропы ў якасці дэкаратыўных раслін. Іх сухія сцёблы ідуць на стварэнне разнастайных дэкаратыўных вырабаў. Баршчэўнік Сасноўскага з'яўляецца перспектыўнай раслінай для фармацэўтычнай прамысловасці, паколькі можа выкарыстоўвацца для вырабу мазяў для лячэння некаторых скурных захворванняў.

Вось мы і пазнаёміліся з раслінамі з такой палохаючай назвай. Толькі цяпер ведаем, які баршчэўнік — для бацвіння, а якога сапраўды варта асцерагацца...

Леанід ЧУМАКОЎ,
кандыдат біялагічных навук, супрацоўнік сектара кадастру раслiннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя У.Ф. Купрэвіча.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

ЯКУЮ ПАГРОЗУ НЯСЕ БАРШЧЭЎНІК САСНОЎСКАГА?

Сок баршчэўніку ўтрымлівае спецыфічныя рэчывы (эфірныя алеі і кумарын), якія, трапляючы на скуру, выклікаюць на ёй змены, а затым ультрафіялет сонечных прамянёў актывуе іх, і ў выніку ўтвараецца фітахімічны апёк. Звычайна такія пашкоджанні неглыбокія, яны не патрабуюць аператыўнага ўмяшання (скурнай пластыкі), але пасля іх часта застаюцца рубцы. **Загадчык апёкавага аддзялення гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі г. Мінска Дзмітрый МАЗАЛЕЎСКІ** растлумачыў, што атрутныя рэчывы могуць заставацца ў скуры доўгі час, і паўторнае ўздзеянне ўльтрафіялету на тую ж вобласць можа прывесці да пашкоджанняў нават праз некалькі дзён. Апёкі баршчэўніку вельмі балючыя, яны суправаджаюцца свербам, болем, чырванню. На скуры з'яўляюцца пухіры, затым яны лопаюцца. Гэта прыносіць не толькі вялікі дыскамфорт пацярпеламу, але і можа стаць падставай для выпіскі бальнічнага.

— Небяспечны не толькі сок, — сцвярджае загадчык аддзялення, — але і спецыфічны пах. Атрутныя часціцы ўтрымліваюцца і ў паветры побач з раслінай, могуць трапіць у дыхальную сістэму чалавека. Гэта можа выклікаць цяжкую алергічную рэакцыю ў людзей з хранічнымі абструктыўнымі хваробамі лёгкіх, хворых на бранхіяльную астму. Патэнцыйна такі від баршчэўніку можа ўяўляць пагрозу для жыцця. Калі ў чалавека ёсць алергічная схільнасць, праблемы з сістэмай органаў дыхання (хранічны бранхіт, эмфізема лёгкіх і інш.), то яму лепш пазбягаць кантакту з раслінай.

Таксама трэба памятаць, што баршчэўнік, які можа дасягаць 2 м у вышыню, вылучае кропелькі атрутнага соку на лісці, таму небяспечна нават проста праходзіць каля яго.

Як абараніць сябе пры барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага на сваім участку:

— Неабходна поўная экіпіроўка, каб абараніць скурныя покрывы, органы дыхання і зроку;

— выкарыстоўваць толькі гумавыя пальчаткі (пальчаткі з тканіны не ратуюць ад соку);

— калі сок трапіў на адзенне, здымаць яго можна толькі ў пальчатках, а мыць асобна ад іншага;

— надзець шчыток на твар, рэспіратар;

— да зараснікаў баршчэўніку ў лесе лепш не набліжацца.

Калі кантакту з раслінай не атрымалася пазбегнуць, варта памятаць, што апёк з'явіцца пасля таго, як ультрафіялет актывізуе атрутнае рэчыва на скуры, таму сок неабходна адразу ж змыць вялікай колькасцю праточнай вады з якім-небудзь мыйным сродкам, абараніць гэта месца ад пападання святла. Калі ўтварыўся апёк, трэба накласці чыстую павязку (бінтам з аптэчкі ці ручніком, любой чыстай тканінай) і звярнуцца да ўрача.

Вольга ПРАЛЮК. *pralyuk@zviazda.by*

■ Экалагічны лікбез

За бруднае паветра адказалі рублём

Адным з кірункаў дзейнасці органаў Мінпрыроды з'яўляецца ахова атмасфернага паветра. Для мінімізацыі выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра органамі Мінпрыроды праводзіцца работа, накіраваная на безумоўнае выкананне суб'ектамі гаспадарання прыродаахоўных мерапрыемстваў, укараненне (мадэрнізацыю) газаачышчальных установак, эфектыўнае выкарыстанне паліўна-энергетычных рэсурсаў і павелічэнне выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі і інш. Між тым пры правядзенні праверак рэгулярна выяўляюцца парушэнні патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства ў частцы аховы атмасфернага паветра.

Так, Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў межах кантролю за выкананнем патрабаванняў заканадаўства ў частцы аховы атмасфернага паветра ў лютым бягучага года ўстаноўлены факт выкіду адным са сталічных прадпрыемстваў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра без спецыяльнага дазволу. У адпаведнасці з законам «Аб ахове атмасфернага паветра» юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць гаспадарчую і іншую дзейнасць, звязаную з выкідамі забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц выкідаў, абавязаны атрымліваць дазвол на такія выкіды і выконваць умовы, прапісаныя ў дазволах. Пры дэталёвым вывучэнні абставін справы ўстаноўлена, што названае прадпрыемства ажыццяўляе дзейнасць, звязаную з выкідамі забруджвальных рэчываў, без адпаведнага дазволу на працягу 6 месяцаў, а значыць, яно прычыняла шкоду навакольнаму асяроддзю. У гэтым выпадку вінаватая асоба ў адпаведнасці з ч. 2 арт. 15.48 КоАП прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу на суму 230 руб. Акрамя таго, па факце прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю прад'яўлена прэтэнзія на суму 577,91 руб.

За 6 месяцаў 2017 года органамі Мінпрыроды планава праверана 1 254 суб'екты гаспадарання. Праведзена 150 пазапланавых праверак. Па выніках кантрольнай дзейнасці за парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 6210 асоб, сума накладзеных штрафаў склала 993 512 руб.

Магілёўскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па факце работы без адпаведнага дазволу ў дачыненні да аднаго з прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці ў сакавіку бягучага года быў пачаты адміністрацыйны працэс. Па выніках разгляду вінаватыя асобы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з ч. 2 арт. 15.48 КоАП у выглядзе штрафу на суму 1242 руб., па факце прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю прад'яўлена прэтэнзія на суму 2359,48 руб.

У цяперашні час накладзеныя штрафныя санкцыі задаволены ў поўным аб'ёме.

Аляксандр ЦАБРУК,
намеснік начальніка ўпраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Мінпрыроды

«ЧУЖЫНЦЫ» НЕ ПРОЙДУЦЬ!

Пранікаючы за тэрыторыю свайго натуральнага арэала, чужародныя віды раслін і жывёл могуць нанесці значную шкоду прыродзе і яе жыхарам

З-за свайго геаграфічнага становішча, трансгранічнага характару рачных басейнаў, размяшчэння на межах фізіка-геаграфічных падзон Беларусь выступае як рэгіён-акцэптар («прыёмшчык») чужародных відаў.

Па словах **кіраўніка міжведамаснага цэнтра па інвазіўных відах пры Акадэміі навук Беларусі, доктара біялагічных навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі Віталя СЯМЕНЧАНКІ,** у цяперашні час у краіне зарэгістравана 25 чужародных відаў водных беспазваночных, 13 відаў рыб, 120 відаў наземных беспазваночных, у асноўным насякомых. Сярод раслін чужароднымі з'яўляюцца каля 800 відаў, з іх 350 відаў ужо наносяць і могуць нанесці шкоду прыродзе і чалавеку.

На думку большасці навукоўцаў, асноўныя прычыны інвазіі чужародных відаў — гэта гаспадарчая дзейнасць чалавека, антрапагенная трансфармацыя тэрыторый і глабальнае змяненне клімату. Прадстаўнікі замежнай флоры і фаўны трапляюць да нас з дапамогай наземнага і воднага транспарта, інтрадукцыйнай работы, у выніку якой віды наўмысна ці ненаўмысна заносяцца ў прыродныя экасістэмы, а таксама праз гандаль раслінамі і жывёламі без папярэдняга карантыннага абследавання. Пад уплывам змянення клімату многія расліны і жывёлы з паўднёвых рэгіёнаў пачынаюць рухацца на поўнач.

— З цягам часу гэтыя працэсы будуць толькі ўзмацняцца, таму стрымаць нашэсце інвазіўных відаў не ўяўляецца магчымым, бо нельга спыніць гаспадарчую дзейнасць чалавека, — упэўнены Віталь Сяменчанка. — Аднак варта ацэньваць наступствы ад укаранення чужародных відаў для мінімізацыі будучай шкоды, у тым ліку і распрацоўкі адпаведных мер.

Па словах навукоўца, у Беларусі пакуль не падлічана эканамічная шкода ад інвазіўных відаў. Галоўным чынам шкода носіць экалагічны характар (драпежніцтва, перанос розных інфекцый, прамое выцясненне абарыгенных відаў). У той жа час шэраг відаў наносіць эканамічную і сацыяльную шкоду. Сярод іх — баршчэўнік Сасноўскага (выдзяляе атрутны сок), амброзія палыналістая і цыклахена дурнічнікалістая (выклікаюць алергію і запаленне дыхальных шляхоў чалавека), эладэя канадская (прыводзіць да зарастання азёр і вадасховішчаў), амерыканскі паласаты рак (пераносчык захворвання «рачыная чума», у выніку якога гінуць нашы абарыгенныя віды ракаў), малюскі дрэйсена і літогліф (першы з іх абрастае гідратэхнічныя збудаванні, перашкаджаючы іх рабоце, другі — пераносчык небяспечных паразітаў), янотападобны сабака (пераносчык шаленства).

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

З-за нізкай колькасці ці абмежаванага распаўсюджання па тэрыторыі краіны не ўсе чужародныя для беларускай прыроды віды з'яўляюцца яе ворагамі. Але ў будучым, пад уздзеяннем розных умоў, сітуацыя можа змяніцца. Таму ў Канвенцыі ААН аб біялагічнай разнастайнасці адзначаецца: з'яўленне чужародных відаў — заўсёды негатыўны фактар.

Вераніка КОЛАСАВА.
kolasava@zviazda.by

«АГРЭСАРЫ» Ў ЛІЧБАХ

Па інфармацыі Мінпрыроды, за апошні год плошча, якую займае баршчэўнік Сасноўскага, у асноўным па краіне скарацілася з 2083,87 га да 2038,1 га. А вось колькасць месцаў знаходак сумніку канадскага з 2014 па 2016 год узрасла. Найбольш часта гэта расліна сустракаецца ў Мінскай вобласці — 1331 знаходка, найбольш рэдка — на Гомельшчыне (56). Апошняя ж з'яўляецца лідарам у краіне па плошчы распаўсюджання эхінацысцісу лопасцевага («шалёнага агурка») — 49,7 га. У апошнія гады гэта расліна таксама паступова распаўсюджваецца па краіне. Расце і колькасць месцаў, і плошча клёна ясенялістага (па звестках 2016 года ён расце на 4039 месцах і 322,9 га), а таксама рабініі лжэакацыі (з 43,3 га ў 2014 годзе ў 2016-м яе плошча павялічылася да 154,2 га).

У кастрычніку 2016 года ў Магілёўскай вобласці адбылося пасяджэнне, на якім была адобрана стратэгія барацьбы з інвазіўнымі відамі дзікарослых раслін на 2017—2025 гады. Асноўная мэта стратэгіі — поўная ліквідацыя месцаў росту баршчэўніка ў Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцях, г. Мінску і значнае скарачэнне месцаў росту ў Віцебскай (на 30%) і Мінскай (на 50%) абласцях.

Як расказаў **начальнік аддзела біялагічнай разнастайнасці Мінпрыроды Аляксандр ГІРАЕЎ,** работа па выўленні і знішчэнні інвазіўных відаў дзікарослых раслін у Беларусі вядзецца з 2008 года. Распаўсюджванне і рэгуляванне такіх відаў, як баршчэўнік Сасноўскага і сумнік канадскі, рэгулюецца згодна з пастановай Савета Міністраў, а таксама Планамі мерапрыемстваў, распрацаванымі органамі мясцовай улады ва ўсіх раёнах краіны.

У адпаведнасці з 2 ч. арт. 21.14 КоАП Рэспублікі Беларусь парушэнне іншых правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў цягне за сабой накладанне штрафу ў памеры да 25 БВ, на ІП — ад 10 да 50 БВ, на юрыдычную асобу — ад 20 да 100 БВ.

■ Прыродныя рэсурсы

ЭНЕРГІЯ З НЕТРАЎ ЗЯМЛІ

НАКОЛЬКІ ЭФЕКТЫЎНА ЦЯПЛО ПЛАНЕТЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА Ў НАШАЙ КРАІНЕ

У верасні здадуць у друк першы ў Беларусі геатэрмічны атлас. Як ён складаўся, для чаго наогул патрэбна такая інфармацыя аб цяпле ўнутры Зямлі і як яе можна выкарыстоўваць у жыццезабеспячэнні краіны, расказалі доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар БДУ Уладзімір ЗУЙ і малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута геалогіі НАН Маргарыта ДУБАНЕВІЧ.

Алена Васілёнак, Маргарыта Дубаневіч і Уладзімір Зуй падчас даследаванняў.

— Калі ўпершыню ў Беларусі зацікавіліся падземнымі крыніцамі цяпла?

Уладзімір Зуй (У. З.): — Самая першая вытворчая тэрмаграма на тэрыторыі Беларусі была атрымана ў 1954 годзе ў глыбокай свідравіне ў раёне Ельск—Нароўля. Аднак з пасляваеннага часу, гэта значыць з канца 1940-х гадоў, пры бурэнні рэгістравалі тэмпературу ў нафтапошукавых свідравінах, а займаліся гэтым не навуковыя, а вытворчыя арганізацыі.

Геатэрмія як навука развіваецца з сярэдзіны 1960-х гадоў — тады пачаліся рэгулярныя даследаванні. У Акадэміі навук БССР была створана Лабараторыя геахімічных праблем у рангу НДІ, у межах якой быў створаны сектар геатэрміі. За мінулыя гады шмат было перайменаванняў, перападначаленняў, але да снежня 2015 года Дзяржаўнае прадпрыемства «НПЦ па геалогіі» выконвала тэму па стварэнні серыі геатэрмічных карт для тэрыторыі краіны. Цяпер гэтыя даследаванні завершаны, і ідзе работа над складаннем атласа.

— Якая інфармацыя будзе змяшчацца ў геатэрмічным атласе Беларусі?

Маргарыта Дубаневіч (М. Д.): — Атлас складаецца з карт і тлумачальнай запіскі. На картах паказана размеркаванне тэмпературы на розных інтэрвалах глыбіні: 100, 200, 300, 400, 500 метраў і 1, 2, 3, 4 кіламетры. Акрамя карт тэмператур, для гэтых жа глыбінь будуць пабудаваны карты размеркавання велічыні шчыльнасці здабываемых рэсурсаў геатэрмальнай энергіі. Карты забяспечваюць карыстальнікаў інфармацыяй аб эквіваленце ўмоўнага паліва, якое можа быць здабыта з нетраў на пэўнай глыбіні ў зададзеным населеным пункце. Адзначу, што гэта першы такі атлас у гісторыі Беларусі. Раней былі карты асобных участкаў тэрыторыі краіны.

— Дзе ў Беларусі самыя высокія падземныя тэмпературы, а дзе — самыя нізкія?

У. З.: — Самая нізкая тэмпература была зарэгістравана ў Прыпяцкім прагіне ў свідравіне Перадрэчыцкая №1, дзе на вертыкальнай глыбіні 6,4 км тэмпература склала 135—140 °С. У цэлым на гэтай тэрыторыі на глыбіні 4 км тэмпература можа перавышаць 100 °С. На жаль, пакуль што не прапрацавана тэхнічна пытанне здабывання гэтага цяпла. Нізкія тэмпературы назіраюцца ў цэнтральнай і паўночна-ўсходняй частках краіны.

М. Д.: — Увогуле па краіне найбольш высокія тэмпературы нетраў характэрныя для Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Тут на глыбіні 100 м тэмпература можа дасягаць 12—13 °С, у той час як сярэдняя тэмпература на ўсёй астатняй тэрыторыі на глыбіні да 100 м звычайна не перавышае 7—8 °С.

— Як на практыцы можа выкарыстоўвацца гэтая інфармацыя?

У. З.: — Звесткі аб цеплавым струмені ўжо выкарыстоўваюцца як у розных прадпрыемствах народнай гаспадаркі, так і індывідуальнымі забудоўшчыкамі. У пачатку 2000-х гадоў у Беларусі пачалі з'яўляцца геатэрмічныя ўстаноўкі. Яны дазваляюць выкарыстоўваць цяпло Зямлі для ацяплення прамысловых будынкаў, офісаў, катэджаў. Першую беларускую ўстаноўку спраектаваў Іван Жыдовіч. На сёння ў нас маецца каля 200 такіх установак.

— А чаму невядома іх дакладная колькасць?

У. З.: — Пакуль што ў нашай краіне не наладжана рэгістрацыя цеплавых установак. Таму гэтая ацэнка ў пэўнай меры прыблізная, на самай справе іх можа быць больш.



Карта размеркавання тэмпературы ў межах Беларусі на глыбіні 100 м.

— Дзе знаходзіцца самая буйная ўстаноўка?

У. З.: — Даволі буйная ўстаноўка працавала на цяплічным камбінаце «Бярэсце» ў раёне горада Брэста. Пакуль яна яшчэ не выйшла на праектную магутнасць. Другая з вядомых мне буйных установак больш за дзесяць гадоў працуе на пагранічным пераходзе «Новая Рудня». Для ацяплення гэтага пункта пропуску разглядалі некалькі крыніц, але пры параўнанні варыянтаў ацяплення прыродным газам, электраэнергіяй, драўняным палівам, падземным цяплом перавага была аддадзена геатэрмальнай энергіі. Так вырашылі стварыць геатэрмічную ўстаноўку на базе трох свідравін. Тэмпература вады на глыбіні 20 метраў складае 9 °С, цеплавы насос падымае яе да 60 °С, і гэта дазваляе ацяпляць адзін чатырохпавярховы будынак і некалькі аднапавярховых. А самая першая ўстаноўка была пабудавана ў Мінску на адным з водазабораў.

— Наколькі эканамічна выгадна выкарыстанне геатэрмічных установак?

М. Д.: — На сёння першапачатковыя выдаткі на геатэрмічныя ўстаноўкі дарагэйшыя, чым на газавыя. Каштуюць яны прыкладна 18—20 тысяч еўра, калі мець на ўвазе звычайны аднапавярховы дом. Тэрмін акупнасці геатэрмічнай устаноўкі — ад трох да 15 гадоў у залежнасці ад шэрагу фактараў. Эксплуатацыйныя ж выдаткі пасля іх запуску ў работу значна ніжэйшыя ў параўнанні з традыцыйнымі ацяпляльнымі кацельнямі. Пры гэтым выкарыстанне геатэрмальнай энергіі мае шмат пераваг. Гэта экалагічна чысты, практычна невычэрпны, аднаўляльны энергарэсурс.



Будучыня за геатэрмальнай энергіяй.

— Ці шмат геатэрмічных установак у свеце?

У. З.: — Калі параўноўваць Беларусь з іншымі дзяржавамі, то ў Эстоніі на сёння дзейнічае каля 5 тысяч такіх установак, у Польшчы — каля 11 тысяч, у Швецыі — больш за 300 тысяч, у ЗША — больш за 600 тысяч. Акрамя гэтага ў Польшчы працуе пяць буйных геатэрмічных станцый, у нас — пакуль ніводнай. У Швецыі выкарыстоўваецца танная электраэнергія, якая выпрацоўваецца атамнай станцыяй і за кошт гэтага вельмі нізкія выдаткі для прывядзення ў дзеянне цеплавых насосаў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
yanovskaya@zviazda.by
Фота з асабістага архіва Маргарыты ДУБАНЕВІЧ

■ У свеце жывёл

Беларускі «араты»

Атрымаць даход з адходаў дапаможа... чарвяк

Не так даўно ў нашых дварах з'явіліся рознакаляровыя кантэйнеры для паасобнага збору смецця, прызначаныя для неарганічных адходаў: шкла, паперы і пластыку. Арганіка ж, якой утвараецца ў разы больш, пакуль не збіраецца, нягледзячы на даўно прыдуманыя спосабы яе ўтылізацыі. Загадчыца сектара вермітэхналогій НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах Святлана МАКСІМАВА расказала, як з карысцю пазбавіцца ад арганічных адходаў пры дапамозе чарвяка.

Беларускі «араты» — спецыяльны від дажджавога чарвяка, здольны ператвараць арганіку ў карыснае ўгнаенне. Ён быў спецыяльна выведзены беларускімі навукоўцамі на прыкладзе вядомага амерыканскага каліфарнійскага чарвяка, які з-за ўмоў надвор'я ў нас не прыжыўся.

Для вытворчасці арганічнага ўгнаення нічога асаблівага не трэба. Галоўнае — разумець прыроду беларускага аратага.

— Падрыхтоўка субстрату — адно з ключавых звёнаў у вермітэхналогіі. Ад яго кампанентаў залежыць агульны стан папуляцыі чарвякоў, інтэнсіўнасць размнажэння і, як вынік, якасць і колькасць канчатковага прадукту — біягумусу, — адзначыла Святлана Максімава. — Для паспяховага вывядзення чарвякоў трэба падтрымліваць пакаёвую тэмпературу ў 15—23 °С, вільготнасць у 70—80% і нейтральную кіслотнасць — 6,5—7,5 pH.

Беларускі «араты», як і любая свойская жывёла, патрабуе пастаяннага догляду і правільнага харчавання.

— Для кармлення чарвякоў можна выкарыстоўваць практычна ўсе арганічныя адходы як сельскагаспадарчай, так і прамысловай вытворчасці. Найбольш прыдатныя для кампосту: гной хатніх жывёл, памёт птушак, бацвінне, салома, торф, пілавінне, галінкі, кардон, папера, адходы ад мяса, рыбы, садавіны і гародніны, — адзначыла Святлана.

Пры арганізацыі міні-фермы неабходна памятаць, што чарвякам патрэбна клятчатка, таму перад пластом кампосту (які ў таўшчыню павінны быць 15—20 см), выкладваецца пяцісантыметровы пласт саломы, пасля чаго града паліваецца. Аптымальная тэмпература вады — каля 20 °С.

— Засяленне чарвякамі праводзіцца праз 15—20 дзён пасля закладкі грады. Перад гэтым правяраюцца кіслотнасць, тэмпература і вільготнасць субстрату. Для гэтага ў невялікую ёмістасць змяшчаецца субстрат з грады і запускаецца 5—10 чарвякоў. Праз суткі іх пералічваюць. Стапрацэнтная выжывальнасць сведчыць пра добрыя ўмовы, — расказала навуковец.

Па меры перапрацоўкі адходаў чарвякі патрабуюць падкормкі. Першая праводзіцца праз 20—30 дзён пасля засялення, наступныя — праз 7—10 дзён. Таксама неабходна сачыць за вільготнасцю. Пры захаваных патрабаваннях праз 3—5 месяцаў вермігумус будзе гатовы.

— Якасны біягумус, як правіла, друзлы, не мае паху, мае аднастайны састаў. Пры сціскванні ён рассыпаецца, а не ўтварае камяк. Па меры гатоўнасці яго прасейваюць, прасушваюць, выкладваюць у тару і выносяць на граду, — адзначыла Святлана Максімава.

З адной тоны кампосту атрымліваецца 600 кг арганічнага ўгнаення, на аснове якога можна вырасціць экалагічную прадукцыю, а таксама 100 кг біямасы чарвякоў, якія служаць выдатным бялковым кармавым дадаткам для жывёл.

Карысць вермікампаставання ўжо ацанілі дзве школы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці, якія ўкараняюць элементы арганічнай сельскай гаспадаркі на прышкольных участках у межах пілотнай ініцыятывы «Беларускага зялёнага крыжа» — часткі праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН.

За паўтара года работы вучні на чале з выкладчыкамі выгадавалі 6,64 тоны экалагічна бяспечных бульбы, агуркоў, кукурузы, фасолі і іншых прадуктаў для харчавання школьнікаў. І на дасягнутым спыняцца не збіраюцца.

— Нашай гароднінай ўжо цікавяцца многія жыхары, таму мы плануем развівацца. Магчыма, створым невялікую бізнес-кампанію, — падзялілася **дырэктар Драчкаўскай школы Таццяна КАЛЯДА.** — Мы ўжо пачалі супрацоўнічаць з мясцовымі кафэ, яны пастаўляюць нам адходы, якімі мы кормім сваіх чарвякоў.

Купляць беларускіх аратых варта толькі ў спецыялістаў, паколькі ў Беларусі жыве 13 відаў дажджавых чарвякоў і толькі адзін з іх найбольш эфектыўна ўтылізуе арганічныя адходы.

Кацярына КІРЭЕВА.
katyakireeva@zviazda.by

■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

БЛЯСК МАЛАНКІ І СТУКАТ ГРАДУ

Чаму адбываюцца і чым небяспечныя гэтыя прыродныя з'явы для чалавека

Фота Максіма МІКЕШЫНА.

Некаторыя атмасферныя з'явы назіраюцца часта і праяўляюцца спакойна, напрыклад, дождж ці снег. А іншыя адбываюцца радзей, але яны яркія, маляўнічыя, кароткатэрміновыя і ўражальныя. Да іх можна аднесці навальніцу і град.

Як звязаныя навальніца, гром і маланка

Узнікненне навальніцы звязанае з раздзяленнем «плюсавых» і «мінусавых» зарадаў у навальнічным воблаку. Ніжняя частка кроплі зараджана дадатна, а адмоўны зарад размяшчаецца ў верхняй яе частцы. У выніку ствараюцца моцныя электрычныя палі ўсярэдзіне навальнічнага воблака і па-за ім. Паступовае назапашванне вялікіх аб'ёмных зарадаў прыводзіць да іскравога разраду — маланкі.

Шаравая маланка

Часцей за ўсё ў навальнічнае надвор'е ў вільготнай атмасферы, насычанай электрычнасцю, з'яўляюцца круглыя аб'екты, якія ляцяць і свецяцца, — шаравыя маланкі. Часам яны ўзнікаюць побач з каналам лінейнай маланкі, прыблізна ў двух з пяці выпадкаў удар лінейнай маланкі суправаджаецца з'яўленнем шаравой. Аднак у 67% выпадкаў шаравая маланка ўзнікала з разетак, электрапрыбораў, радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў, тэлефонаў, батарэй ацяплення і нават цвікоў, убітых у сцяну, гэта значыць з электрычных праваднікоў.

Звычайна шаравая маланка рухаецца хаатычна ў гарызантальнай плоскасці, прыблізна за метр над зямлёй. У сярэднім яна праходзіць за 1 секунду не больш за 2—3 метры.

Шаравая маланка жыве ад 10 да 100 секунд, пасля чаго звычайна бясшумна знікае, павольна згасае ці распадаецца на часткі. Асобныя экзэмпляры самаліквідуюцца з рэзкім воплескам ці нават выбухам.

Верагоднасць убачыць шаравую маланку хоць бы раз у жыцці складае 1 да 10 000.

Калі ў пакой заляцела шаравая маланка, паспрабуйце спакойна і хутка выйсці і зачыніць дзверы з іншага боку, калі не атрымліваецца — хоць бы замерці на месцы.

Як паводзіць сябе ў навальніцу?

Меры засцярогі падчас навальніцы звязаны з тым, што лінейная маланка б'е галоўным чынам у найбольш высокія прадметы. Падчас навальніцы ні ў якім разе нельга:

— знаходзячыся на вуліцы, заставацца каля ліній электраперадачы; хавацца пад высокім адзінокім дрэвам; плаваць у вадаёмах; знаходзіцца ў адкрытай прасторы (полі); карыстацца тэлефонам;

— знаходзіцца ў памяшканні каля акна і разетак; дзверы і вокны трэба зачыніць, выключыць з разетак электрапрыборы; не рэкамендуецца падыходзіць да металічных прадметаў: ванны, кранаў, труб, бо яны могуць праводзіць электрычнасць.

Невыкананне гэтых правілаў можа прывесці да гібелі ці атрымання апёкаў і цяжкіх траўмаў.

Нябесныя брыльянты

Падчас граду льдзінкі разнастайных формаў, памераў і колераў выпадаюць з кучавадажджавых аблокаў пры ліўневым дажджы, пераважна ў цёплую пару года, пры плюсавых тэмпературах (вышэй за +10 °С). Буйны град амаль заўсёды звязаны з навальніцай.

Град выпадае з найбольш магутных ліўневых аблокаў, дзе кроплі вадзяной пары застаюцца вадкімі, знаходзячыся ў няўстойлівым пераахалоджаным стане, на вышыні, дзе тэмпература паветра дасягае -20... -30 °С. Пры гэтым яны растуць з прычыны асядання на іх вадзяной пары і ад зліцця адна з адной. Затым кроплі пачынаюць замярзаць, утвараючы град. Паступова градзіны абрастаюць лёдам ад замярзання пераахалоджанай вады, становяцца настолькі вялікімі, што пачынаюць падаць.

Выгляд, будова і памеры градзін адрозніваюцца вялікай разнастайнасцю. Адна з формаў, што сустракаецца найчасцей, — шарападобная, якая складаецца з унутранага снежнага ядра (часам з празрыстага лёду), акружанага адной ці некалькімі празрыстымі абалонкамі. Бываюць таксама градзіны сфераідальныя, з паглыбленнямі ці з разнастайнымі выступамі, канічныя ці пірамідальныя з вострымі ці злёгку ўсечанымі верхавінамі і закругленай асновай.

Памер градзін бывае ад 5 мм (гарошыны) да 5—10 см (з галубінае яйка і больш). Выпадзенне граду велічынёй ад 6 да 19 мм — неспрыяльная гідраметэаралагічная з'ява, а буйны град у 20 мм і больш адносіцца да небяспечнай гідраметэаралагічнай з'явы. Буйны град у асобным пункце рэдкі, у сярэднім назіраецца адзін раз у 40—50 гадоў. На тэрыторыі Беларусі штогод адзначаюцца 4—5 дзён з градам, у асобныя гады — да 8.

Па градзе — снарадамі

Звычайна град суправаджаецца навальніцай і бывае ў невялікіх навальнічных віхурах (смерчах, тарнада). Наогул смерч, тарнада і град — з'явы, вельмі цесна звязаныя паміж сабой і цыкланічнай дзейнасцю. Град практычна заўсёды выпадае перад ліўнем ці адначасова з ім і амаль ніколі — пасля яго.

Барацьба з градам заснавана на ўвядзенні ў граданебяспечнае воблака спецыяльнага рэагенту, які спрыяе замарожванню пераахалоджаных кропель. Рэагент уводзіцца з дапамогай ракет ці снарадаў у пераахалоджаную частку воблака. У выніку з'яўляецца велізарная колькасць штучных цэнтраў крышталізацыі, на якіх пачынаецца рост ледзяных крышталяў. Пераахалоджаная вада ў аблоках, якая служыць асноўнай сыравінай для росту градзін, пераразмяркоўваецца на значна большую іх колькасць. Таму градзіны атрымліваюцца меншых памераў і паспяваюць цалкам ці ў значнай ступені растаць у цёплых пластах паветра яшчэ да выпадзення на зямлю.

Як паводзіць сябе падчас буйнога граду?

— Калі град заспеў вас у памяшканні, трымайцеся як мага далей ад вокнаў і не выходзьце з дома.

— Калі вы на вуліцы, то паспрабуйце знайсці ўкрыцце ці абараніце галаву ад удараў градзін (прыкрыйце галаву рукамі, сумкай, адзежай)... Не заходзьце ў нізіны, якія ў лічаныя хвіліны могуць напоўніцца вадой, ці ў месцы з найбольшай колькасцю градзін.

— Не шукайце ўкрыцце пад дрэвамі — існуе вялікая рызыка, што ў іх патрапіць маланка, град таксама можа зламаць галіны.

— Калі град заспеў вас падчас язды на аўтамабілі, спыніцеся, пажадана пад эстакадамі, у гаражах, крытых стаянках. Калі сховішча няма, прыцісніцеся бліжэй да краю праезнай часткі, але не з'язджайце ў нізіну, бо яе можа размыць пры інтэнсіўных ападках і магчымым падтапленні. Трымайцеся далей ад шкла, пажадана павярнуцца да яго спінай і закрыць вочы рукамі ці адзеннем.

Таццяна ЖУКАВА,
вядучы інжынер-метэаролаг сектара забеспячэння дыстанцыйных метэаралагічных назіранняў Гідрамета

■ Творчасць

АБ ЭКАЛОГІІ НА МОВЕ МАСТАЦТВА

У ЖНІЎНІ ПРОЙДЗЕ ПЕРШАЯ «ЗЯЛЁНАЯ» ПАСТАНОЎКА «ЭКАТЭАТРА»

Нестандартны тэатр з прыстаўкай «эка» з'явіўся ў Мінску год таму па ініцыятыве трох неабыякавых дзяўчат. Праект, які нацэлены пры дапамозе мастацтва распавесці людзям пра экалагічныя праблемы, быў створаны ў межах конкурсу «Зялёнка» ад экалагічнага таварыства «Зялёная Сетка» і краўдфандынгавай платформы «Талака». Ужо ў пачатку жніўня гледачы ўбачаць першую пастаноўку на «зялёную» тэматыку.

Сваім праектам «ЭкаТэатр» арганізатары плануюць прыцягнуць увагу беларусаў да экалагічных праблем, павысіць узровень адукаванасці, тым самым засцерагчы ад непрыемных сітуацый, якія могуць узнікнуць пры спажывецкіх адносінах чалавека да навакольнага асяроддзя.

Для дзяўчат экалагічны лад жыцця — гэта не проста прыгожыя словы. Яшчэ да праекта яны сартавалі смецце, эканомілі ваду і стараліся выкарыстоўваць менш непатрэбных рэчаў. Цяпер жа яны плануюць дзяліцца ведамі з іншымі.

— Сёння нашы думкі, планы, захапленні і нашы сябры так ці інакш звязаны з экалогіяй. Акрамя «ЭкаТэатра», мы ўдзельнічаем у «зялёных» мерапрыемствах, а некаторыя і самі праводзім. Напрыклад, нядаўна арганізавалі майстар-клас па другасным выкарыстанні лямпачак і тэтрапака. Што датычыцца тэатра, то для нас гэта новая тэма, новы вопыт. Сумясціць тэатр і экалогію нас падштурхнуў тэатральны праект «Сем», у якім я прымала ўдзел, — расказала адна з арганізатараў Марыя Кноп.

Яшчэ адной крыніцай натхнення для дзяўчат стаў Лонданскі экалагічны тэатр, дэкарацыі для якога створаны цалкам з другасных рэсурсаў. Дарэчы, свае пастаноўкі арганізатары плануюць не толькі напоўніць эказместам, але і аформіць адпаведна.

— У нашай камандзе ёсць выдатны архітэктар Рыгор Заборскі, які ўзяўся за пабудову дэкарацый і сцэны з другасных матэрыялаў. Сам жа спектакль пройдзе на свежым паветры. На касцюмах мы не робім акцэнт, таму яны выглядаюць досыць проста, — падзялілася Марыя Кноп.

Пастаноўкі «зялёнага» тэатра пабудаваныя на інтэрв'ю з людзьмі розных узростаў і прафесій, звычайных жыхароў, якія кожны дзень сустракаюцца на вуліцах, у гандлёвых цэнтрах, школах і садках. Таксама арганізатары апыталі экаактывістаў, студэнтаў і падарожнікаў, пасля чаго выбралі самыя цікавыя гісторыі і паклалі іх у аснову сюжэта.

— Наш сцэнарый можна назваць дакументальнай экаўтопіяй, бо большая частка яго заснавана на гісторыях беларусаў. Аднак вельмі шмат часу пайшло на апрацоўку інтэрв'ю, таму першы наш спектакль стартуе толькі праз год пасля заснавання, — расказала Марыя Кноп.

За год працы дзяўчаты сабралі каманду прафесіяналаў, якая дапамагае зрабіць спектакль цікавым, павучальным і запамінальным. Сярод іх — сцэнарыст, рэжысёр, тэатральны крытык, кандыдат мастацтвазнаўства, каардынатар беларускай праграмы «ТэАрт», рэжысёр спектакля «Мова Х» эксперыментальнага тэатра «Галава-Нага» Аляксей Стрэльнікаў, фатограф Марыя Бушко і музыканты (што незвычайна для тэатра) Людміла Пагодзіна і Альберт Літвін.

Удзельнікі «ЭкаТэатра» Уладзіслаў Войшніс, Марына Скрыпнік, Марыя Кноп, Настасся Табальчук.

Фота Канстанціна КРУКАВА.

Каб быць заўсёды «ў тэме», арганізатары падтрымліваюць зносіны з экаактывістамі, валанцёрамі, маніторацъ «зялёныя» падзеі, якія адбываюцца ў беларускіх гарадах. У канцы ліпеня дзяўчаты плануюць прэзентаваць свой праект на форуме грамадскіх экалагічных арганізацый. Яны ўпэўнены, што пасыл экатэатра будзе карысны ўсім.

Наступны спектакль у «ЭкаТэатры» запланаваны на восень. Калі вы жадаеце дапамагчы праекту — далучайцеся да каманды валанцёраў.

Суполкі праекта ў сацыяльных сетках: Ecoteatrminsk (УКантакце), Eco Teatr (Facebook).

Кацярына КІРЭЕВА. *katyakireeva@zviazda.by*

Чытайце ў ліпеньскім нумары часопіса «Родная прырода»:

✓ Што пакажа «ўзрост вады».

✓ Выбіраем бяспечны посуд.

✓ Хай уджаліць цябе пчала!

✓ «Выйшаў за веснічкі — і ў Белавежскай пушчы».

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 431/С-30639 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – одноэтажное кирпичное здание столовой), площадью 286,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 48
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 423355100001000731, площадью 0,0574 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли) по адресу г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 48
Начальная цена продажи	38 647,20 р. (тридцать восемь тысяч шестьсот сорок семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	3 865 р. (три тысячи восемьсот шестьдесят пять рублей)
Условия аукциона	Без условий
Продавец	ОАО «Кореличская сельхозтехника», 231430, Гродненская область, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 46, тел./факс 8-01596-215-62
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 21 августа 2017 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)
Последний день приема заявлений – 15 августа 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/

Паритетбанк

Бухгалтерский баланс на 1 июля 2017 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2017	01.01.2017
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	13 069	12 411
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	32	43
4	Средства в Национальном банке	1103	9 158	14 486
5	Средства в банках	1104	18 060	16 800
6	Ценные бумаги	1105	116 928	111 224
7	Кредиты клиентам	1106	178 898	171 462
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	148	148
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	33 658	34 243
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	879	618
12	Отложенные налоговые активы	1111	-	-
13	Прочие активы	1112	5 178	4 975
14	ИТОГО активы	11	376 008	366 410
15	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
16	Средства Национального банка	1201	-	-
17	Средства банков	1202	67 048	76 660
18	Средства клиентов	1203	203 696	187 552
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	1 502	2 113
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	1 037	869
23	ВСЕГО обязательства	120	273 283	267 194
24	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
25	Уставный фонд	1211	66 056	66 056
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	3 584	3 159
28	Фонды переоценки статей баланса	1214	12 213	12 229
29	Накопленная прибыль	1215	20 872	17 772
30	ВСЕГО собственный капитал	121	102 725	99 216
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	376 008	366 410

ОТЧЕТ о прибылях и убытках
на 1 июля 2017 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2017	01.07.2016
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	15 342	18 315
2	Процентные расходы	2012	5 793	8 609
3	Чистые процентные доходы	201	9 549	9 706
4	Комиссионные доходы	2021	2 151	1 887
5	Комиссионные расходы	2022	439	456
6	Чистые комиссионные доходы	202	1 712	1 431
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	2	7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	153	94
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	1 689	3 612
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	7	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(442)	2 502
12	Прочие доходы	208	164	544
13	Операционные расходы	209	8 038	7 955
14	Прочие расходы	210	335	369
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	5 345	4 568
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	39	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	5 306	4 568

И. о. Председателя Правления С. Н. Белов

Главный бухгалтер И. Б. Сафронова

Дата подписания: 5 июля 2017 г.

http://www.paritetbank.by/about/finance/kvartal/2017/2kvartal/

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27 октября 2014 №5. УНП 100233809

ГУК ДСП «ГОРЕЦКАЯ ПМК №1»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20%
1	Автомобиль легковой ВАЗ 21703, 2008 года выпуска, рег. номер 9699 ВЕ-6	1920,00
2	Автомобиль легковой Great Wall Hover, 2012 года выпуска, рег. номер 3433 ЕЕ-6	9960,00
3	Грузовой бортовой УАЗ 23632-233, 2010 года выпуска, рег. номер АА 4386-6	6840,00
4	Грузовой бортовой ГАЗ 330232, 2010 года выпуска, рег. номер АА 4404-6	6240,00
5	Грузовой бортовой ГАЗ 330232, 2010 года выпуска, рег. номер АА4405-6	6360,00
6	Грузовой бортовой ГАЗ 330232, 2010 года выпуска, рег. номер АА 4422-6	6360,00
7	Грузовой тяг. седельный МАЗ-54323, 1990 года выпуска, рег. номер АА4045-6	2760,00
8	Грузовой тяг. седельный МАЗ-5432 А2, 2009 года выпуска, рег. номер АА4172-6	8400,00
9	Грузовой тяг. седельный КАМАЗ-54112, 1988 года выпуска, рег. номер АА4384-6	2760,00
10	Грузовой самосвал КАМАЗ 5511, 1989 года выпуска, рег. номер АА 4367-6	2880,00
11	Грузовой фургон ГАЗ-66, 1986 года выпуска, рег. номер ТВ4993	3960,00
12	Грузовой специальный автокран МАЗ 630303, 2008 года выпуска, рег. номер АА 4126-6	33840,00
13	Автобус МАЗ-256270, 2009 года выпуска, рег. номер АА 4249-6	11640,00
14	Автобус МАЗ-256270, 2010 года выпуска, рег. номер АА 4369-6	12240,00
15	Трактор Беларус МТЗ 82-1, 2009 года выпуска, рег. номер 7775 ТА-6	10560,00
16	Полуприцеп автомобильный МАЗ 93802 0-(041), 2009 года выпуска, рег. номер А1320 А-6	4920,00
17	Полуприцеп бортовой Tirsan, 1996 года выпуска, рег. номер А 2002 А-6	10560,00
18	Полуприцеп автомобильный УПР-1212, 1991 года выпуска, рег. номер 3625ТВ	1800,00
19	Прицеп тракторный ПТС-4,5, 2010 года выпуска, рег. номер 7254 БЮ	2760,00
20	Бульдозер SD-16, 2008 года выпуска, рег.номер 7680 ТА-6	36000,00
21	Грузовой бетоносмеситель КАМАЗ 65115, 2008 года выпуска, рег. номер АА 4008-6	14400,00
22	Грузовой бетоносмеситель МАЗ 6303 А5-350, 2009 года выпуска, рег. номер АА 4381-6	12720,00
23	Грузовой бетоносмеситель МАЗ 6303А5-350, 2009 года выпуска, рег. номер АА 4410-6	12720,00
24	Грузовой бетоносмеситель МАЗ 6303А3, 2009 года выпуска, рег. номер АА 4146-6	11880,00
25	Экскаватор погрузчик Амкадор Беларус 82П 702ЕА-01, 2007 года выпуска, рег. номер ТА-6 4013	11160,00
26	Экскаватор одноковшовый ЕК 14-20, 2010 года выпуска, рег. номер 7779 ТА-6	28560,00
27	Подъемник монтажный ОПТ-9195, 2010 года выпуска, рег. номер 7685 ТА-6	21120,00
28	Погрузчик Амкадор 332С4, 2010 года выпуска, рег. номер 7795 ТА-6	23640,00
29	Погрузчик Амкадор 332С4, 2011 года выпуска, рег. номер ТВ-6 0515	26400,00
30	Остатки товара ликвидируемого строительного магазина согласно перечню https://sites.google.com/site/pcjuristcom/stroitelnyj-magazin	43452,39

Торги в отношении имущества проводятся впервые.
Окончание приема заявлений в 17.00 21.08.2017

Дата и время проведения торгов	**22 августа 2017 года в 13.00** по адресу: г. Горки, ул. Советская, 9
Шаг аукциона	5 %
Задаток	10% от начальной стоимости предмета торгов
Организатор торгов	ООО «Фрондера», +37529 395 36 35
Информация о продавце	ГУК ДСП «Горецкая ПМК №1», Могилевская область, г. Горки, ул. Советская, д. 9 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)
Условия для участия в торгах	1. До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах. 2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. 3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету). 4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 5. Транспортные средства не сняты с учета в ГАИ. 6. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона

БПС-СБЕРБАНК

Уважаемые клиенты!

В связи со снижением с 19.07.2017 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь **с 13% до 12%** (годовых),

ОАО «БПС-Сбербанк» **с 19.07.2017** снижает на 1 процентный пункт размер процентов по действующим договорам срочных банковских депозитов для физических лиц в белорусских рублях: «Сохраняй», «Пополняй», «Управляй», «Безотзывный», заключенным до 01.04.2016.

Согласно Условиям указанных депозитов, установленный размер процентов будет применен **с 19.08.2017**.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот №1. Изолированное помещение кирпичный гараж площадью 19,3 метров квадратных инв. №200/D-96163 стоимостью 2200,00 руб.
Собственник (владелец) имущества	Николаева (Краснова) Светлана Михайловна
Местонахождение (адрес) имущества	Лот №1. Витебская обл., г. Витебск, г. п. Руба, Железнодорожный р-н, гаражно-строительный кооператив №2 (ГСК-2), блок 1, гараж №13
Наличие обременений	Не обременено
Место (адрес), дата и время проведения торгов	03.08.2017 в 11.00 г. Витебск, ул. Кирова, д. 16, каб. 4
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска 210001, г. Витебск, ул. Кирова, д. 16. Судебный исполнитель – Свистунова Анна Ивановна, тел./факс (80212) 60-84-46, начальник отдела – Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212) 60-84-42
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с №BY38AKBB36429030003282000000, филиал №200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, УНП 300002505, код банка AKBBBY21200, не позднее 9.00 02.08.2017 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 55%) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГОТТЦ «ГАРАНТ»

Предмет торгов, краткая характеристика	**Лот №1** **Капитальное строение с инв. № 443/С-16440** (гараж) общей площадью 121,9 кв. м, одноэтажное кирпичное здание с металлическими воротами, 1990 г. п.		
Местонахождение имущества	Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Октябрьская, 34		
Информация о земельном участке	Имущество расположено на земельном участке площадью 0,0150 га с кадастровым номером 425650100001004605, назначение – для обслуживания здания гаража		
Начальная цена	**7 182 руб. 00 коп. с учетом НДС**	Сумма задатка (1%)	**71 руб. 82 коп.**
Сведения о продавце	ОАО «ГОТТЦ «Гарант», г. Гродно, ул. Врублевского, 86/1, тел. 8(0152) 430354		
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка	Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код 739, УНП 500481906		
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов	Условия оплаты	по согласованию сторон
Торги состоятся 3 августа 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8			
Срок подачи документов: **по 28 июля 2017 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8**			
Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 04.02.2017 г., от 11.04.2017 г., от 10.06.2017 г.			
Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by			
Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8 (0152) 77 23 79, 74 49 11			

Минский филиал РУП «Белпочта»

приглашает принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для выполнения работ по проектным, строительно-монтажным и пуско-наладочным работам на объекте «Проектные и строительно-монтажные работы по оборудованию охранной сигнализацией отделения почтовой связи №2 в микрорайоне №10 г. Молодечно». Переговоры состоятся 20 июля 2017 года в 10.00 в кабинете 216 в здании Минского филиала по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к 3. Источник финансирования работ – собственные средства предприятия. По всем вопросам обращаться по тел. 207-84-66 – начальник отдела СР и ХО Иванов И. В.

УНП 101120215

ЗЁЛКАВЫ ФЭСТ НА ПЯТРОВІЦУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Удзельнікаў летніка сёлета было не меней як паўсотні чалавек, і яны прыехалі з розных куткоў Беларусі, нават з Літвы і Расіі. Вядома, гэта не тыя старажытныя фэсты, якія збіралі сотні, а можа і тысячы людзей з усёй акругі. Сучасны любанскі фэст на Пятра і Паўла сваім фарматам нагадвае рэгіянальны фестываль аўтэнтычных песень і танцаў. Але мясцовы каларыт у гаворках, у песнях і танцах робіць адметнай святочную атмасферу.

Традыцыйнымі ў свяце сталі і малебен каля крыжа на скрыжаванні галоўных вясковых вуліц, і павязванне абракальных стужачак на двухсотгадовым дубе за ваколіцай, і абыход вёскі «дзявочым войскам» с песнямі і карагодамі, і распальванне вогнішча, і кумленне маладых пар. А яшчэ варылася трацыйная пятровіцкая юшка ў знак таго, што святыя Пётр і Павел былі простымі рыбакамі. А потым былі скокі і танцы, як кажуць, да ўпаду: на Любаншчыне захавалася адметная манера бытавых танцаў і, на шчасце, не перавяліся сапраўдныя віртуозы ігры на гармоніку.

Пасля «Пятровіцы» на Любаншчыне пачынаюцца першыя зажынкі — яшчэ адна каштоўная традыцыя, якую захоўваюць вясковыя носьбіты духоўнай спадчыны пры падтрымцы руплівых работнікаў культуры раёна.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Любанскі раён

Больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на сайце zviazda.by

СКАРЫНА ЯК ПЕРАМОЖЦА

«1517» — НАГОДА ДЛЯ РАЗВАЖАННЯЎ

У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі адбыўся перадпрэм'ерны паказ новага спектакля, прысвечанага 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, які называецца «1517». Яго стваральнікі па-свойму падышлі да асэнсавання такой знакавай у беларускай гісторыі падзеі. Кім быў Скарына?.. Чалавекам, які не проста апярэдзіў свой час, а перамог яго.

Рэжысёрам спектакля (разам са Зміцером Бейнартам-Саладухам) выступіў Павел Харланчук-Южакоў, ён расказаў карэспандэнту «Звязды»:

— Так павялося, што нашы аматарскія, з хрысціянскім ухілам праекты ладзяцца штогод. Пачалося ўсё яшчэ з дзіцячага спектакля «Маё сэрца б'ецца», пастаўленага ў абарону жыцця. А пасля мы рабілі пастаноўку да юбілею Мікалая Радзівіла Чорнага. Цяпер — да юбілею Бібліі, выдадзенай Скарынам. Мы ведалі, што твораў, прысвечаных гэтай даце, будзе шмат — як і іншых твораў — таму шукалі ўласную форму. Людзі ведаюць, што Скарына — першадрукар, перакладчык, выдатная персона... Але мы паспрабавалі зразумець, што ён зрабіў гэтым перакладам, што значыла перакласці Біблію на родную мову? Што гэта быў за крок, у якую барацьбу ён уступіў і ўсіх нас, беларусаў, за сабою ўцягнуў?.. Мы падумалі, што Скарына пераклаў Біблію на родную мову і такім чынам нас далучыў да гэтай вечнай спрэчкі — ёсць ці няма, верыць ці не верыць, матэрыяльнае ці духоўнае?.. Ён абвострыў выбар, які дае Бог. Мы паспрабавалі паглядзець на ўсё з такога пункту гледжання, што ён уступіў у барацьбу, сеў па той бок стала.

Так увасоблены настаўнік, які моцна паўплываў на Скарыну.

Застаецца хіба крыху шкадаваць, што сам Павел Харланчук, хоць і займаўся актыўна падрыхтоўкай спектакля як рэжысёр, у якасці акцёра на сцэну не выходзіць. Ён лічыць, што гэта вельмі складана — быць і з аднаго боку сцэны, і з другога. Да таго ж яму крыху няёмка і самому ставіць спектакль, і быць у галоўнай ролі. Але, падаецца, удзел Харланчука як бясспрэчна любімага гледачамі акцёра яшчэ больш упрыгожыў бы гэтую і без таго моцную пастаноўку.

— Гістарычную канву спектакля мы стараліся рабіць, наколькі нам дазвалялі дакументы, дакладнай. Францыск Скарына — найбольш вядомая беларуская асоба, для драматургаў у гэтым ёсць і перавага і выклік, — гаворыць **аўтар п'есы гісторык Андрусь УНУЧАК,** які працаваў над ёй разам з пісьменнікам Аляксеем Шэіным. — Перавага, бо ўсе вядомыя дакументы даўно апублікаваныя і даступныя. Выклік палягае ў тым, што мы ўжо маем замацаваны ў мастацтве вобраз Скарыны, і таму вельмі цяжка паглядзець на яго па-новаму, з сучаснай перспектывы... Назва спектакля «1517» сімвалічна паказвае галоўную ідэю — прадэманстраваць выданне першай беларускамоўнай кнігі, Бібліі Скарыны, як паваротны момант не толькі ў біяграфіі першадрукара, але і ў беларускай гісторыі. Мы імкнуліся ўвасобіць Скарыну, які прагне змяніць свет да лепшага, пастаянна шукае спосаб як гэта зрабіць найлепш, знаходзіць і здзяйсняе сваё пакліканне.

У спектаклі паказана дзяцінства Францыска, час, калі ён атрымаў ступень доктара ў Падуі. Асноўныя дзеянні адбываюцца ў Празе. «У сваіх разважаннях мы абапіраліся на прадмову, у якой Скарына піша, што Біблія — гэта лекі для душы. Улічваючы, што ён сам быў лекарам, гэта вельмі важнае адкрыццё. Гэта тое, што лечыць не цела, а душу, — удакладняе **мастацкі кіраўнік праекта Алена СІТНІК.** — У спектаклі ёсць момант, як Скарына вылечыў чалавека ад нейкай хваробы, а пасля той нарабіў шмат кепскага. Таму Францыск стаў задумвацца: што лечыць душу?.. Мы прыйшлі да высновы, што гэта Слова Божае».

Адметна, што ў гэтым спектаклі на прафесійнай сцэне іграюць акцёры-аматары — мастак, інжынер, будаўнік, хатняя гаспадыня. Але разам з імі ў персанажаў эпохі Скарыны пераўвасабляюцца і прафесіяналы — артысты Драматычнага тэатра Беларускай арміі Яўген Казакевіч і Уладзімір Лісоўскі, Максім Брагінец з Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі і Ганна Харланчук.

Падаецца, «1517» — гэта больш, чым проста спектакль. І таксама больш, чым злепак з гістарычнага мінулага беларусаў. Ён дае магчымасць задумацца над вечнымі пытаннямі, але робіць гэта не ва ўлтыматыўнай форме. У той час як на сцэне выказваюцца дыяметральна супрацьлеглыя погляды, глядач міжволі задумваецца, на чыім ён баку і што б сказаў, каб таксама ўдзельнічаў у гэтым дыялогу?..

Хтосьці з гледачоў сказаў, што прыйшоў на пастаноўку, каб «закрыць пытанне кнігадрукавання». Гэта значыць, што такі вялікі, 500-гадовы, юбілей не павінен прайсці міма нікога. І калі хтосьці яшчэ не зразумеў, што для яго асабіста значыць гэта дата, як ён ставіцца да першакнігі Скарыны, ёсць час, каб паразважаць над гэтым.

Варта дадаць, што гэта была толькі папярэдняя прэм'ера. Асноўныя паказы адбудуцца ўвосень. Не прапусціце.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

nina@zviazda.by

Пантэон Айчыны

АЛЬГЕРД (1296 — 1377)

Летапісец з павагай да яго напісаў: «Гэты Альгерд вельмі разумны быў... і пераўзышоў санам і ўладай усіх; і ўстрыманне меў вялікае, усякай мітусні ўнікаў, на забавы, гульні і падобнае не зважаў, але клапаціўся дзень і ноч пра дзяржаву сваю і п'янства ўнікаў: віна і піва, і мёду, і ўсялякага напою хмельнага не піў, бо ненавідзеў п'янства і вельмі ўстрыманы быў ва ўсім: і ад гэтага вялікі розум і развагу набыў, і дасціпнасць прыдбаў, і гэтым многія землі і дзяржавы павяваў, і гарады, і княствы ўзяў за сябе, і трымаў уладу вялікую, і прымнажалася княства яго болей за ўсіх, чым за бацьку, чым за дзеда, такі быў. Бо звычай Альгерда такі, ніхто не ведаў што, куды думаў раццю выступіць або навошта збірае шмат воінства, як і самыя тыя вайсковыя чыны і раць уся не ведалі куды ідуць: ні свае, ні чужыя, ні госці прышэльцы: у таямніцы ўсё тварыў разумна, каб не дайшла вестка ў зямлю, на якую хацеў ісці раццю: і такой хітрасцю забраў многія землі, узяў многія гарады і дзяржавы зняволіў; не столькі сілай, як дасціпнасцю. І быў ад яго жах на ўсіх, і пераўзышоў княжаннем і багаццем». Альгерду па праве можна даць тытул Вялікі, ён яго заслужыў.

Сваёй нястомнай дзейнасцю ён не толькі абараніў Вялікае Княства ад крыжакоў, але і значна пашырыў дзяржаўныя межы, вызваліў украінскія землі ад татара-мангольскага ярма.

У 1318 годзе Альгерд ажаніўся з дачкой віцебскага князя Яраслава Марыяй і пасля смерці цесця ў 1320 годзе пераняў віцебскі пасад. Альгерд дзейсна дапамагаў бацьку ў яго справах, узначаліў у 1327 годзе паход на Брандэнбург. Доўгае княжанне ў Віцебску сярод праваслаўнага люду зрабіла яго сваім сярод русінаў. У Віцебску ён пабудаваў царкву і ўзвёў мураваныя сцены. А калі ў 1342 годзе Альгерд разам з братам, троцкім князем Кейстутам (яны нарадзіліся ад другой жонкі Гедзіміна, полацкай княгіні Вольгі), і пляменнікам Любкам Воінавічам адбілі крыжацкі паход на Узборск, пскавічы прапанавалі Альгерду хрысціцца і стаць іх князем. Ён адказаў, што ён хрышчоны, а замест сябе прапанаваў князем свайго сына Андрэя. Неўзабаве Андрэй з бацькавай дапамогай стаў Полацкім князем, а Псковам правіў праз намеснікаў. Калі ўлічыць, што ад бацькі Альгерду дасталося Крэўскае княства, дык Альгерд быў самым моцным князем у ВКЛ. Але роля ўдзельнага князя Альгерда не задавальняла. У 1345 годзе з дапамогай Кейстута Альгерд авалодаў Вільняй і пазбавіў малодшага брата Яўнута велікакняжацкага пасада, зрабіўшыся вялікім князем. Пераварот, які сапраўды пайшоў на карысць дзяржаве. Альгерд не толькі ўзначаліў кіраванне краінай, але дзейсна дапамагаў братам: Кейстуту абараняць Троцкае княства, валынскаму князю Любарту ваяваць супраць польскага караля Казіміра, навагрудскім князям абжываць Падолле. Сам жа праводзіў палітыку збірання ўсходнеславянскіх зямель, вызначыўшы яе так: «Уся Русь павінна належаць Літве». І Альгерд мэтанакіравана ажыццяўляў пастаўленую задачу. У 1356 годзе, скарыстаўшыся замятняй у Бранску, ён авалодаў гэтым горадам, а праз два гады далучыў да ВКЛ Мсціслаў. Найбольшага поспеху Альгерд дамогся ў 1362 годзе, калі на рацэ Сінія Воды разбіў войскі Крымскай, Перанойскай і Ямбалуцкай ордаў, што дало магчымасць вызваліць ад татарскай улады ўкраінскія землі і далучыць да ВКЛ Кіеў, Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Пуціўль, Белую Царкву, Звянігарад, Падолле, якое перадаў сынам навагрудскага князя Карыята. У Кіеве стаў княжыць Уладзімір Альгердавіч, які адбудаваў горад і аднавіў Сафійскі сабор. Тыя ж Карыятавічы падымалі з руін Падолле. Так вось княжылі на Русі «літоўскія заваёўнікі». Калі князь Андрэй Багалюбскі разбурыў Кіеў, дык літвін Уладзімір Альгердавіч ратаваў «маці рускіх гарадоў» ад заняпаду. Меней паспяховым было змаганне Альгерда з Маскоўскім княствам. Малады і дзейсны маскоўскі князь Дзмітрый Іванавіч (вядомы пазней па мянушцы Данскі) таксама збіраў вакол Масквы рускія землі. Тройчы, у 1368, 1370, 1372 гадах, Альгерд пры падтрымцы Кейстута, смаленскага князя Святаслава Іванавіча хадзіў на Маскву. Мэтай паходаў было заступніцтва за Цвер, якой пагражаў маскоўскі князь. У барацьбе за сваю самастойнасць цвярскія князі абапіраліся на Альгерда, які ажаніўся з цвярской княгіняй Уллянай. Для бачнасці Дзмітрый Іванавіч адмаўляўся ад прэтэнзій на Цвярское княства, нават вяртаў захопленыя ў яго землі, але пасля адыходу Альгерда зноў нападаў на Цвер, а ў 1375 годзе ўвогуле захапіў яе. Каб нейтралізаваць уплыў Альгерда, маскавіты ачарнялі яго перад канстанцінопальскім патрыярхам, называючы «паганцам», «ворагам крыжа». З іх падачы была складзена показка аб трох закатаваных Альгердам літвінах-хрысціянах. Патрыярх зняў з рускіх князёў, што прынеслі Альгерду клятву вернасці, крыжовае цалаванне. Альгерд вельмі абураўся падобным нягодніцтвам маскоўскага князя і мітрапаліта. І наракаў на апошняга ў грамаце да патрыярха: «Трэба мітрапаліту блаславіць маскавітаў, каб дапамагалі нам, паколькі мы ваюем за іх з немцамі».

Літвіны і русіны ВКЛ ваявалі з немцамі не толькі за маскавітаў, наўгародцаў і пскавіцян, але і за палякаў. Польскі кароль Казімір дзеля міру з ордэнам саступіў яму Памор'е і накіраваў свае сілы на завяванне Галіцкай Русі і Валыні. Альгерд дапамагаў валынскаму князю Любаргту адбіць польскую пагрозу, але давесці вайну да перамогі перашкаджалі крыжакі. Уражвае лічба паходаў крыжакоў на ВКЛ: з 1345-га па 1377 гады (час праўлення Альгерда), 70 тысяч прускіх і 30 лівонскіх рыцараў. У асноўным гэта былі дробныя набегі, «рэйзы», на памежныя землі, але адбываліся і буйныя паходы з прыцягненнем да іх еўрапейскіх сіл. Гэтак у паходзе 1345 года ўдзельнічалі чэшскі і ўгорскі каралі, Маркраф Мараўскі і іншыя. Імклівыя дзеянні Альгерда, які напаў на Прусію, прымусілі крыжакоў паспяшыць з Літвы на абарону сваіх уладанняў. Паход 1348 года, у якім удзельнічалі нямецкія, французскія і нават англійскія рыцары, закончыўся буйной бітвай 2 лютага на рацэ Стрэве.

Войска Альгерда, у якім былі дружыны з Пінска, Полацка, Віцебска, Берасця, Смаленска і Уладзіміра Валынскага, пацярпела паражэнне, загінуў пінскі князь Глеб-Нарымонт. Але і крыжакі панеслі значныя страты і вымушаны былі перайсці да тактыкі дробных набегаў. Іх як мог адбіваў Кейстут. А калі надаралася магчымасць, Альгерд арганізоўваў буйныя паходы ў адказ. 17 лютага 1370 года ў бітве каля замка Рудава (цяпер Мельнікава Калінінградскай вобласці Расіі) з абодвух бакоў загінула больш за 5 тысяч воінаў.

Альгерд і Кейстут спрабавалі дыпламатычнымі захадамі спыніць ордэнскую армію. Яны гатовы былі прыняць каталіцтва. У 1358 годзе на перамовах з імператарскімі і ордэнскімі пасламі Альгерд прапанаваў перасяліць ордэн у «Дзікае поле», каб там крыжакі абаранялі хрысціян ад нападаў татараў, а ордэнскія землі перадаць Літве. У сваю чаргу крыжакі патрабавалі землі, падараваныя ім яшчэ Міндоўгам. На гэта Альгерд рашуча адказаў: «Цяпер відавочна бачу, што ў вас клопат не аб маёй веры, як кажаце, а аб грашах».

Пры Альгердзе ВКЛ зрабілася сапраўды магутнай дзяржавай, найважнейшым удзельнікам міжнароднай палітыкі і адыгрывала ў ёй значную ролю. Але, пэўна, не гэта ўсцешыла Альгерда перад смерцю, а ягоныя 12 сыноў, якім даставаўся плён яго жыцця. А сам ён прыняў манаства пад імем Алексій, каб з'явіцца перад Богам з ачышчанай душой.

Вітаўт ЧАРОПКА.

■ Дзеля памяці

НАД ПАЛАЮЧЫМ МОСТАМ КАЛЯ ПОЛАЦКА

5 ліпеня адбылася знакавая падзея для аматараў гісторыі — полацкія краязнаўцы ўстанавілі ў аграгарадку Клясціцы памятную шыльду недалёка ад ракі Нішчы на месцы, дзе калісьці стаяў драўляны мост падчас вайны 1812 года.

У Клясціцах каля самай дарогі размяшчаецца прыродны валун, на ім і ўсталявалі памятную шыльду наступнага зместу:

«Гэтым каменем адзначана месца моста, дзе ў 1812 г. грэнадзёры 2-га батальёна Паўлаўскага грэнадзёрскага палка кінуліся на падпалены мост, першымі вызвалілі вёску Клясціцы 19 ліпеня 1812 г. і тым самым спынілі наступленне французаў на сталіцу Санкт-Пецярбург, Расійскай імперыі».

Гранітны камень быў дастаўлены на памятнае месца старшынёй Клясціцкага сельвыканкама Мікалаем Хаменкам.

Памятная табліца выраблена па ініцыятыве і за сродкі трох полацкіх краязнаўцаў: Андрэя і Аляксея Бухавецкіх, Мікіты Ізідзерава, шыльда ўстаноўлена да 205-гадовага юбілею Айчыннай вайны, Клясціцкай бітвы ў вайне 1812 года. На таблічцы паказаны момант карціны Пітэра Хеса «Бітва пры Клясціцах».

У 2008 годзе падчас рэканструкцыі Клясціцкай ГЭС быў скід узроўню вады, адкрыліся натуральныя берагі ракі Нішчы. З вады паказаліся драўляныя палі старога моста, Мікалай Хаменка сфатаграфаваў іх. Краязнаўцы адзначылі месца, дзе праходзіў бой за гэты мост, на сённяшні дзень выяўлена дакладнае месца, дзе стаяла французская батарэя на высокім беразе ракі, адкуль французы ў 1812 годзе вялі агонь па рускіх войсках.

Вызначыць дакладнае месца моста краязнаўцам дапамог план бітвы пры Клясціцах з архіва Санкт-Пецярбурга. На плане паказана дакладна, дзе па абодвух баках ракі Нішчы на момант вайны 1812 года быў той самы адзіны мост.

Бітва пад Клясціцамі — трохдзённы бой паміж французамі і асобным корпусам рускай арміі каля вёскі Клясціцы (цяпер у Расонскім раёне) у ходзе вайны 1812 года.

Свае войскі Вітгенштэйн размясціў максімальна зручна для атакі. На світанку 19 ліпеня 1812 года пачалася бітва, якая лічыцца першай і бясспрэчнай перамогай рускіх войскаў у вайне 1812 года.

Для здабыцця перамогі корпусу Вітгенштэйна было неабходна пераправіцца цераз Нішчу і выбіць французаў з мястэчка Клясціцы. Але пераправа цераз раку знаходзілася пад моцным агнём французскай артылерыі. Атрад Кульнева з дзвюма гарматамі лёгкай 27-й роты адшукаў непадалёк брод цераз раку і пачаў праследаванне непрыяцеля. Удзіно, разумеючы, што Клясціцы яму ўжо не ўтрымаць, загадаў запаліць мост і рыхтавацца да адступлення. Па палаючым месце наперад кінуўся 2-і батальён Паўлаўскага грэнадзёрскага палка, у той час як гродзенскія гусары і ямбургскія драгуны пачалі пераходзіць раку Нішчу ўброд.

У гэтай бітве рускім войскам пад камандаваннем генерала Вітгенштэйна ўдалося атрымаць перамогу, нягледзячы на колькасную перавагу французскіх войскаў.

Андрэй БУХАВЕЦКІ

■ Выстаўкі

МУЗЕЙ ФАРТЫФІКАЦЫІ І ЎЗБРАЕННЯ З'ЯВІЦЦА Ў БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

Пра тое, што ў музеі «Форт №5», які з'яўляецца філіялам мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», плануецца стварыць новую экспазіцыю, расказаў на адкрыцці выстаўкі дырэктар мемарыяльнага комплексу Рыгор БЫСЮК.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

